ТАЯМНІЦЫ СТАРОГА ПАРКУ

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПА-КАРАЛЕЎСКУ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 ЖНІЎНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 152 (29266)

9-24 стар.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Урад цяпер думае над тым, як стымуляваць рост удзелу грамадзян у добраахвотных накапляльных праграмах. Каб людзі больш актыўна адкладвалі сабе на пенсію. Гэтая сістэма ў любым выпадку будзе развівацца, будзем працаваць над стымулюючымі мерамі, каб умовы былі прывабнымі. Мы ідзем па такім жа шляху , як і іншыя краіны».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Усім, хто будзе галасаваць, мы павінны даць магчымасць зрабіць гэта спакойна»

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт на нарадзе па забеспячэнні бяспекі выбарчай кампаніі. На сустрэчу, якая адбылася ўчора ў Палацы Незалежнасці, былі запрошаны кіраўнікі Саўміна, палат парламента, сілавых ведамстваў, Вярхоўнага суда і Адміністрацыі Прэзідэнта.

Фота БелТА.

33 «АСІЛКІ» ЁСЦЬ, А ХТО ДЗЯДЗЬКА ЧАРНАМОР?

Каб зняць размовы пра «33 асілкаў» (так Прэзідэнт, услед за медыя, назваў затрыманых прадстаўнікоў прыватнай ваеннай кампаніі «Вагнер»), кіраўнік дзяржавы даў даручэнне запрасіць у Беларусь генеральных пракуроў Украіны і Расіі. «Усе ж заклапочаныя гэтай праблемай, сур'ёзная праблема. Пакладзіце ўтраіх (генеральныя пракуроры трох краін. — **«Зв.»**) перад сабой міжнародныя дамовы і пагадненні, якія ў нас з Расійскай Федэрацыяй і Украінай, што мы падпісалі ў шматбаковым плане (мы ж абавязкі ўзялі на сябе і ў гэтай сітуацыі таксама), нашы законы.

СТАР. 2

КАРАТКА

- МНС выдала дазвол на загрузку паліва на першым энергаблоку БелАЭС, яна пачнецца 7 жніўня.
- Прыём заявак для ўдзелу ў нацадборы на дзіцячае «Еўрабачанне-2020» завяршаецца 15 жніўня.
- Пад Гродна адкрылі доплераўскі метэаралагічны радыёлакатар.

- Кінафестываль «Лістапад» пройдзе 6–13 лістапада.
- У Беларусі завяршылі папярэднія выпрабаванні доследнага ўзору баявой машыны ЗРК «Аса».

- Міжнародная федэрацыя барацьбы адмяніла рашэнне аб пачатку спаборніцтваў з верасня.

ISSN 1990 - 763X

Рыхтуемся да школы

ЗАМШ, СТРАЗЫ, КАРУНКІ І КАНТРАСНЫЯ ГУЗІКІ

Што прапануюць вучням беларускія вытворцы адзення

Фота БелТА.

Бясплатная падгонка адзення, зніжкі да 70 % на мадэлі мінулых гадоў. Новыя тканіны і ўборы. Павышэнне цаны на школьныя ўборы айчыннай вытворчасці не больш як на 10 %. Усё гэта і не толькі чакае беларусаў, якія рыхтуюцца да новага навучальнага года. Што сёлета апрануць на лінейкі вучні, у колькі гэта абыдзецца бацькам і як не спусціць сямейны бюджэт на школьных базарах, расказалі спецыялісты.

СТАР. 3

На свае вочы

РОБАТЫ... ГАРАДСКІЯ І СЕЛЬСКІЯ

Як у фільмах пра касмічныя падарожжы, віцебскіх газавікоў цяпер дапускае на работу медыцынская інтэлектуальная сістэма, а наведвальнікаў крамы кансультуе выява спецыяліста.

Генеральны дырэктар УП «Віцебскаблгаз», заслужаны энергетык Рэспублікі Беларусь Пётр Шэршань і яго каманда ўмеюць здзіўляць. Гэта ўжо традыцыя. Іх прадпрыемства не сорамна паказаць нават прасунутым спецам у сферы віртуальных тэхналогій, заможным людзям, у якіх нібыта ўсё ёсць. А сярэднестатыстычны турыст, напэўна, будзе адразу ж у шоку...

За адзін дзень віцебскія газавікі прадэманстравалі некалькі навінак.

На пачатку насычанага падзеямі дня яны адкрылі сваю тэлерадыёстудыю. Для кансультацыі перад тым запрашалі работнікаў дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. Цяпер у «газавай ТРК» ствараюць разнастайны відэаматэрыял. У прыватнасці, у інфармацыйна-аналітычнай праграме «Дакладна» адказваюць на актуальныя пытанні грамадзян, даюць неабходныя кансультацыі, дапамагаюць сарыентавацца ў выбары газавыкарыстальнага абсталявання. Запісы можна ўбачыць як на фірменным сайце, так і на адным з дзяржаўных тэлевізійных каналаў.

СТАР. 4

«Усім, хто будзе галасаваць, мы павінны даць магчымасць зрабіць гэта спакойна»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Старшыня Следчага камітэта вам даложыць разам з Камітэтам дзяржаўнай бяспекі і аператыўную інфармацыю, і інфармацыю следчых аб расследаванні. Вось дакументы, вось інфармацыя — на стол. Не прыедуць — пытанне вырашым мы без іх», — сказаў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што трэба праблему разглядаць з пункту гледжання законаў (а не па прынцыпе: хто гучней скажа па тэлевізары), але ёсць яшчэ адзін важны нюанс — чалавечнасць, «бо законы не ўсё прадугледжваюць».

«І мы вырашым гэту праблему. Ніякай палітызацыі быць не павінна. Нам не трэба спектаклі ні палітычныя, ні эканамічныя. І пужаць нас таксама не трэба наступствамі. Мы ведаем пра ўсе наступствы. Не трэба нас пужаць амерыканцамі, натаўцамі. Не амерыканцы і не натаўцы сюды даслалі 33 чалавекі, калі на тое пайшло, — заявіў кіраўнік краіны. — Сядзьце ўтрох, рабіце, як лічыце магчымым, на падставе нашых законаў, міжнародна-прававых актаў прыміце рашэнне па гэтых хлопцах».

Па словах Прэзідэнта, ён учора размаўляў з украінскім калегам Уладзімірам Зяленскім, і пазіцыя беларускага лідара была адназначная: «У нас ёсць беларускія законы. Правапарушэнні яны здзяйснялі на тэрыторыі Беларусі», — сказаў Прэзідэнт.

ПЕСНІ ПАД ЧУЖОЕ КАРАОКЕ

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што фокус праблем сёння змясціўся толькі на баевікоў ПВК, але ў краіне затрымана шмат іншых людзей, якія ставілі мэтай дэстабілізацыю абстаноўкі ў Беларусі.

«Вядомыя імёны, адрасы, паролі, яўкі. Усё вядома. Да цудаў часам даходзіць. Усе сродкі масавай інфармацыі папярэджваюць нас, што нас тут жадаюць захапіць амерыканцы, натаўцы. Але некаторых людзей затрымалі з амерыканскімі пашпартамі, жанатымі з амерыканкамі, якія працуюць у Дзярждэпе», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, прычына такому здавалася б несупадзенню інтарэсаў — грошы. «Усё проста — грошы, бабкі. Няважна: амерыканец, дзярждэпавец, прыналежнасць твая да дэмакрытычнай партыі... Ворагі Расіі, удзельнічалі ў перадвыбарчай кампаніі ў Расіі, атрымалі за гэта добрыя грошы, хайпаваліся на тэрыторыі Беларусі. Думаў, амерыканцы зараз пачнуць іх абараняць. Нічога падобнага, — праінфармаваў Прэзідэнт. — Грошы засцілаюць вочы. Пазелянелі ад гэтых грошай. Няважна, дзе і што. Хто плаціць, за таго і пяюць».

Прэзідэнт пахваліў за хуткую рэакцыю не толькі органы дзяржаўнай бяспекі, міліцыю, мясцовую ўладу, але і звычайных грамадзян, якія дапамаглі міліцыі з інфармацыяй.

ГІБРЫДНАЯ ВАЙНА: УСЕ СУПРАЦЬ УСІХ?

Прэзідэнт папрасіў міліцыю не расслабляцца, бо ідзе гібрыдная вайна.

«Мы не ведаем, на што яны здольныя. Мы нават не ведаем, хто яны — ці амерыканцы з натаўцамі, ці з Украіны нас хтосьці падціскае, ці ўсходныя браты «моцна любяць». Я ж сказаў: ідзе гібрыдная вайна супраць Беларусі, і мы павінны чакаць поскудзі з любога боку», — працягнуў Прэзідэнт.

Ён параіў сілавікам «абапірацца на нашых людзей, на беларусаў — яны зразумелі, што могуць страціць краіну».

Менавіта таму, на думку Прэзідэнта, шмат людзей пайшло галасаваць датэрмінова.

Ён перакананы: гэта сведчыць, што «людзі насцярожыліся. Яны ўчапіліся за гэты кавалак зямлі і яго страціць не жадаюць».

КАБ НЕ ЎСПЫХНУЦЬ ВОГНІШЧУ

Яшчэ адна тэма нарады, якую агучыў лідар краіны, — «гэта альтэрнатыўны падлік галасоў у дзень выбараў». Ён даручыў Генеральнай пракуратуры, судам даць ацэнку законнасці гэтых ініцыятыў.

«Усім, хто будзе галасаваць, мы павінны даць магчымасць зрабіць гэта спакойна, святочна, калі хочаце, не баючыся нападкаў і ўмяшання ў асабісты выбар чалавека. Я вельмі сур'ёзна маніторы сітуацыю па галасаванні — годна, прыгожа, ідуць людзі, нікому не перашкаджаюць. Хтосьці на дачу хоча паехаць у выхадны, хтосьці яшчэ куды. Мы ж не па пошце галасуем, як у некаторых дзяржавах», — адзначыў Прэзідэнт.

Выказаўся Аляксандр Лукашэнка наконт «закліку на майдан 9–10 жніўня»: «Не дай бог мы распалім вогнішча ў цэнтры Мінска і будзем раскідваць галавешкі па ўсім Мінску. Гэта мы дапусціць не можам і не дапусцім».

Марыя ДАДАЛКА.

Падчас Паслання беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Аляксандр Лукашэнка казаў пра тое, што выбарчыя камісіі будуць ахоўваць ад абраз і перасьледу. Учора на нарадзе ён падкрэсліў, што ў дзяржавы дастаткова рэсурсаў для абароны людзей, «якія амаль бясплатна працуюць на краіну».

«Паўтараю задачу МУС і Генеральнай пракуратуры: усе, хто абражаў і працягвае гэта рабіць, запалохваў і працягвае гэта рабіць, дзяржаўных служачых, ваеннаслужачых, членаў выбарчых камісій (асабліва падкрэсліваю), работнікаў вертыкалі ўлады, павінны быць прыцягнутыя да адказнасці, як таго патрабуюць нашы законы і Канстытуцыя», — сказаў Прэзідэнт.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трагедыя ў Бейруце выклікала шырокі водгук у свеце

Еўракамісія выдаткуе больш 33 млн еўра Лівану для пераадолення наступстваў выбуху ў порце Бейрута. Пра гэта гаворыцца ў заяве ЕК па выніках тэлефоннай размовы кіраўніка Еўракамісіі Урсулы фон дэр Ляен з ліванскім прэм'ер-міністрам Хасанам Дзіабам, паведамляе ТАСС. Старшыня таксама прапанавала падтрымку ЕС для правядзення поўнай ацэнкі патрэб у рэканструкцыі горада і аднаўленні краіны, а таксама садзейнічанне ў дыскусіях з міжнароднымі фінансавымі інстытутамі, якія маглі б дапамагчы выдзеліць далейшую эканамічную дапамогу.

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон першы з сусветных лідараў наведаў ліванскую сталіцу пасля трагедыі. Ён заявіў пра намер Францыі ініцыяваць праграму міжнароднай падтрымкі насельніцтву Лівана.

Расія накіравала ў Ліван некалькі самалётаў МНС з ратавальнікамі і абсталяваннем для разгортвання аэрамабільнага шпіталя, а таксама спецыялістаў атрада «Цэнтраспас» і псіхолагаў МНС.

У Лос-Анджэлесе арганізатарам вечарынак адключаць ваду і электрычнасць

Жыхарам Лос-Анджэлеса, якія будуць праводзіць дома забароненыя цяпер вечарынкі, адключаць ваду і электрычнасць, паведаміў мэр горада. Ён адзначыў, што гэтая мера накіравана на скарачэнне распаўсюджвання каранавіруса ў горадзе. «Пры тым, што мы ўжо закрылі ўсе начныя клубы і бары, гэтыя маштабныя хатнія вечарынкі ператварыліся практычна ў начныя клубы... У сувязі з гэтым я дазваляю адключаць паслугі дэпартамента водазабеспячэння і электрычнасці Лос-Анджэлеса ў тых недапушчальных выпадках, калі дамы, арганізацыі і іншыя пляцоўкі прымаюць забароненыя вялікія сходы», — сказаў мэр падчас прэс-канферэнцыі, якая трансліравалася ў Youtube.

Паводле апошніх звестак, у акрузе Лос-Анджэлес зафіксавана звыш 197 тысяч выпадкаў заражэння і 4825 выпадкаў смерці ад каранавіруснай інфекцыі. Штат Каліфорнія, дзе знаходзіцца Лос-Анджэлес, знаходзіцца на першым месцы па колькасці выпадкаў заражэння ў ЗША.

На Марсе знайшлі сляды старажытных ледавікоў



На раннім этапе свайго фарміравання Марс быў пакрыты сеткай ледавікоў. Пра гэта гаворыцца ў даследаванні канадскіх палеантолагаў, апублікаваным у навуковым часопісе Nature Geoscience.

Такое заключэнне было зроблена на аснове вывучэння дзясяткаў тысяч фатаграфій паверхні планеты. Яны былі супастаўленыя з фотаздымкамі падледавіковых нізін, размешчаных на востраве Дэвон у канадскай Арктыцы. Навукоўцы пацвердзілі падабенства рэльефаў дзвюх планет, у прыватнасці, знайшлі практычна аднолькавыя сляды ад ледавікоў.

Падабенства рэльефаў дзвюх тэрыторый дае зразумець, што на Марсе знаходзілася вялікая колькасць старажытных ледавікоў, якія ўтварыліся ў выніку наяўнасці вады і прысутнасці халоднага клімату. У пачатку свайго фарміравання планета падыходзіла для зараджэння жыцця, але каля 3,6 мільярда гадоў таму Марс стаў падобны на пустыню.

Выбары–2020

Адказнасць за будучыню

Спробы дэстабілізаваць сітуацыю не да дабра краіне і самім людзям

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Такое меркаванне выказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, калі ўчора прыняў удзел у датэрміновым галасаванні на выбарах Прэзідэнта. Датэрмінова — праз графік працы, бо ў нядзелю Уладзімір Андрэйчанка не будзе прысутнічаць у Мінску.

«На кожным з нас сёння ляжыць каласальная адказнасць за будучыню Беларусі, і таму выбар кожнага мусіць быць усвядомлены, каб Беларусь і надалей развівалася, каб нашы людзі маглі спакойна жыць, працаваць. І важна захаваць стабільнасць, бяспеку, якія ёсць у нас сёння, таму што гэта аснова паляпшэння дастатку, дабрабыту нашых людзей. Вось за гэта я і прагаласаваў», — лічыць спікер ніжняй палаты Парламента.

Ён падкрэсліў абавязковае прытрымліванне Канстытуцыі пры правядзенні ўсіх палітычных кампаній у нашай краіне. Беларускае выбарчае заканадаўства Уладзімір Андрэйчанка назваў вельмі прагрэсіўным.

«Мы тройчы ўносілі змяненні і дапаўненні ў Выбарчы кодэкс, яны даволі высока ацэнены нашымі Палатамі, парламенцкімі структурамі. Таму ў людзей, якія сёння спрабуюць дэстабілізаваць сітуацыю ў Беларусі, мне здаецца, адзін настрой – што трэба выклікаць у грамадстве нейкі пратэстны настрой. Гэта не да дабра краіне і тым жа людзям. Таму мы павінны праяўляць спакой, вытрымку — і я бачу, што людзі на гэта і настроены», — адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Правёўшы ў апошні час шмат сустрэч, у тым ліку ў рэгіёнах, Уладзімір Андрэйчанка прыйшоў да высновы, што беларусы разумеюць: толькі працай, дысцыплінай, правапарадкам можна зрабіць краіну сучаснай, квітнеючай.

Варвара МАРОЗАВА.

НЕ ЗАСТАЦЦА ЎБАКУ

Грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі Рэспублікі Беларусь, у ліку якіх Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, РГА «Белая Русь», Беларускі саюз жанчын, БРСМ, творчыя саюзы, нацыянальныя дыяспары, напярэдадні выбараў выступілі са зваротам.

«Нашы арганізацыі — гэта мільёны неабыякавых грамадзян. Мы аб'яднаны па розных напрамках і поглядах. Але сёння мы разам, плячо ў плячо, з'ядналіся дзеля адзінай мэты: абараніць родную зямлю ад нахабнай хлусні і здрады, ад жадання разарваць адзінства нашага грамадства і пахіснуць дзяржаўныя асновы. Хочам адкрыта і рашуча заявіць: мы будзем самі вырашаць, у якой краіне жыць і гадаваць дзяцей. Не трэба нас раз'ядноўваць!» — гаворыцца ў звароце.

Аўтары звароту заклікаюць грамадзян Беларусі: «Не застанемся ўбаку, прыйдзем на выбарчыя ўчасткі і прагаласуем за краіну, якую любім і якой ганарымся!»

Блізкая ўлада

ТРАДЫЦЫЯ НЕ ПАРУШАЕЦЦА

Традыцыйна, па суботах, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 18 ліпеня, з 9:00 да 12:00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый Анатолевіч МАЛАШКА. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

ЗАМШ, СТРАЗЫ, КАРУНКІ І КАНТРАСНЫЯ ГУЗІКІ

АЙЧЫННЫ АСАРТЫМЕНТ І ДАДАТКОВЫЯ ПАСЛУГІ

Для вучняў сёлета выпускаюць 500 мадэляў дзелавога адзення для школы, 285 з якіх новыя, а таксама 200 варыянтаў абутку і больш за 70 мадэляў трыкатажнай прадукцыі.

Мяркуецца, што айчынная прамысловасць (дзесяць прадпрыемстваў швейна-трыкатажнай галіны, якія ўваходзяць у склад канцэрна «Беллегпрам») пашые каля 600 тысяч швейных і трыкатажных вырабаў. Хоць пару гадоў назад толькі швейнай прадукцыі для школы выпускалася больш за мільён. Сёлетняе змяншэнне заказу абумоўлена вялікай колькасцю мадэляў, якія засталіся з мінулых гадоў, растлумачыў **Вадзім ЛАМКОЎ, намеснік старшыні «Беллегпрама».**

— Школьны сезон сёлета пачаўся крыху пазней, чым звычайна. На гэта паўплывала сітуацыя на рынку краіны праз каранавірус — прадпрыемствы ў красавіку—маі арыентаваліся ў асноўным на выпуск сродкаў аховы. Таму мы не праводзілі паказы школьнага адзення і прэзентацыі. Аднак увесь комплекс работ мы правялі і працягваем іх. Прадпрыемствы гатовыя на працягу тыдня адшыць любую разумную колькасць дадатковых заказаў да запланаванага аб'ёму, калі яны будуць.

Асартымент тавараў для школы сфарміраваны ў асноўным за кошт прадукцыі айчыннай вытворчасці. Для поўнага задавальнення спажывецкага попыту недахоп дапаўняецца імпартнымі таварамі. У гандаль ужо паступіла больш за 400 тысяч вырабаў: 260 тысяч швейных і 145 тысяч — трыкатажных. Школьнікам прапануецца да 100 мадэляў ранцаў, заплечнікаў і сумак са святлоадбівальнымі элементамі. Прадстаўлены разнастайны асартымент школьных пісьмовых і канцылярскіх прылад, расказала **Наталля МЕЛЬНІКАВА, намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання, начальнік аддзела спажывецкага рынку МАРГ:**

— У рэгіёнах краіны арганізавана работа больш як 350 школьных базараў, кірмашоў, праводзяцца выстаўкі-продажы, кірмашы выхаднога дня. Афармлены куткі першакласніка і школьніка, выдзелены дадатковыя месцы для продажу. Тэматычна афармлены гандлёвыя залы і вітрыны, размешчаны шыльды і планшэты-ўказальнікі. Прадукцыю для школьнікаў можна набыць у больш чым 10 тысячах рознічных гандлёвых аб'ектах.

Графік правядзення школьных кірмашоў у сталіцы, абласных гарадах і райцэнтрах змешчаны на сайце канцэрна «Беллегпрам».

Пакупнікам будуць аказваць і дадатковыя паслугі, накшталт папярэдніх заказаў на тавары школьнага асартыменту або падгонкі адзення па фігуры. У сталічным ЦУМе, прынамсі, з 15 да 31 жніўня прыладзіць убор пад камплекцыю вучня дапамогуць бясплатна.

ВЫЦІСКАЕМ З ЦЭН ЛІШНІЯ КАПЕЙКІ

Сёлета мадэльеры запусцілі ў вытворчасць шмат мадэляў сучаснага адзення для хлопчыкаў і дзяўчынак. Больш стала трыкатажных вырабаў, а ў вытворчасці абутку арыентуюцца на мадэлі з натуральных тэкстыльных валокнаў. Для школьнікаў прадугледжана даволі шмат нестандартных мадэляў, а таксама вырабаў з рэгулятарамі, якія можна падагнаць па фігуры дзіцяці.

Арыенціровачны кошт камплектаў адзення дзелавога стылю для вучняў — ад 60 да 303 рублёў. А цана на набор школьна-пісьмовых прылад і канцылярскіх тавараў можа вар'іравацца ад 22 да 183 рублёў.

— У асноўным удалося захаваць цэны на ўзроўні мінулага года. Яны падраслі на 3—10 % пераважна з-за выкарыстання новых матэрыялаў і імпартных закупак, — запэўніў Вадзім Ламкоў. — Мы хочам захаваць канкурэнтаздольнасць ва ўмовах, калі прадукцыя лёгкай прамысловасці паступае ў краіну неабмежавана. Каб утрымацца на рынку, мы змагаемся за цэны і выціскаем з іх лішнія капейкі. Уся адзежа для школьнікаў адпавядае стандартам, якія існуюць для гэтай групы тавараў. А ўключэнне хімічных і сінтэтычных нітак у касцюмы адпавядае патрабаванням хімічнай і біялагічнай бяспекі.

Прываблівающь айчыннага пакупніка да набыцця тавараў беларускага легпраму і зніжкамі.

— Скідкі на школьны асартымент, якія прадпрыемствы гандлю прапануюць сумесна з айчыннымі вытворцамі тавараў, даходзяць да 70 %. На мадэлі дзелавога стылю, якія выпушчаны ў 2016—2018 гадах, прадпрыемства «Калінка», напрыклад, дае зніжкі ад 45 да 70 %. А на асобныя леташнія мадэлі — да 40 %, — падзялілася Наталля Мельнікава. — Удвая танней можна набыць мадэлі 2017—2018 гадоў і ў фірменных крамах «Камінтэрна» і «Палесся». А некаторыя прадпрыемствы змяншаюць цэны і на вырабы 2020 года.

Каб падрыхтавацца да школы, прапануюцца таксама праграмы крэдытавання і растэрміноўкі за ўласныя сродкі і сумесна з банкамі, у крамах праводзяцца дні зніжак. На 15—16 жніўня запланаваны, дарэчы, адзіны дзень зніжак, якія будуць даходзіць да 40 %. Адбудуцца таксама акцыі са скідкамі да 25 % для шматдзетных сямей, дамоў сямейнага тыпу, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. У буйных крамах арганізуюцца дабрачынныя акцыі «Збяром партфель разам».

СТРОГАЯ КЛАСІКА І ЯРКІЯ ДЭТАЛІ

Дакладных патрабаванняў да школьнага стылю няма, аднак ёсць рэкамендацыі. Галоўную ролю ў вызначэнні вонкавага выгляду навучэнцаў іграе савет установы адукацыі, падкрэсліла **Ірына БУЛАЎКІНА, галоўны спецыяліст упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Мінадукацыі:**

— Адзенне дзелавога стылю вельмі разнастайнае, і яго можна камбінаваць, што дазваляе вучням выглядаць элегантна, прыгожа і сучасна. Пры гэтым адзенне школьніка павінна настройваць на рабочы лад і не адцягваць ад навучальнага працэсу яго і навакольных. У гэтым навучальным годзе ў краіне будзе працаваць каля трох тысяч установаў адукацыі для навучання больш як мільёна школьнікаў, 114 тысяч з якіх першакласнікі.

Асартымент адзення для школы вельмі разнастайны: ад строгіх цёмных касцюмаў да яркіх вырабаў. Сярод навінак штаны-кюлоты, сарафаны-камізэлькі, кроп-топы, бомберы, спадніцы-плісэ.

У строях для хлопчыкаў прадугледжаны элементы з замшу, вышыўкі, кантрасных гузікаў, петляў і дэкаратыўных закрэпках. Дапаўняецца вобраз штанамі свабоднага стылю тыпу кэжуал і смарт-кэжуал. Папулярнымі застаюцца штаны-чынасы з бавоўны і вузкія штаны з полівіскознай тканіны.

— Больш шырока, чым летась, у гэтым годзе прадстаўлены кашулі ў класічным стылі, трыкатажныя кашулі і «двойкі» — трыкатаж плюс тэкстыль. Гэта досыць новы і модны кірунак. Прадстаўлены як насычаныя, так і стрыманыя колеры, — ахарактарызаваў школьныя ўборы Вадзім Ламкоў. — Укараняюцца новыя віды малюнкаў жакардавых палоцен: клеткі, дыяганальны рубчык, варыянты дробнай крошкі, трохколерны жакардавы малюнак. А таксама дэкаратыўныя элементы: манжэты, планкі, лампасы, дэкаратыўная тасьма, здымныя дэталі, штучная пячаць і іншае.

Дзяўчынкам акрамя класічных блузак са змешаных баваўняных тканін прапануюцца святочныя ўборы, упрыгожаныя шыфонам, гіпюрам, карункамі, плісэ, зборкамі, атласнай тасьмой, стразамі. А таксама камбінаваныя блузкі з трыкатажных палоцен, блузкі з прынтаванай віскознай тканіны.

З'яўляецца тэндэнцыя да таго, каб элементы школьнага адзення можна было насіць і ў штодзённым звычайным ужытку. Для гэтага ўборы шыюць з тканін, якія лёгка мыць, і яны не камечацца, — дадаў ён. Прадпрыемствы легпрама выконваюць таксама заказы для асобных устаноў адукацыі, якія просяць шыць для сваіх навучэнцаў мадэлі па індывідуальных эскізах.

Ірына СІДАРОК.

Надвор'е

Прыпячэ да 30 градусаў!

Гэты тыдзень выдаўся на фоне сваіх папярэднікаў даволі цёплы. Апошнімі днямі паветра па ўсёй тэрыторыі Беларусі прагравалася ўдзень да 23—29 градусаў, а на поўдні тэмпература і ўвогуле дасягала адзнак у плюс 30–32. А вось ападкаў было нямнога — яны рэгіс траваліся толькі ў асобных раёнах. Такое па-сапраўднаму летняе надвор'е нам падарыў антыцыклон з цэнтрам над краінамі Балтыі. Яго ўплыў захаваецца і на гэтыя выхадныя. Падрабязней пра сінаптычную абстаноўку расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Такім чынам, сёння па-ранейшаму чакаецца сонечна і пераважна без ападкаў. І нават крыху спякотна — да 25—30 градусаў. Праўда, у ноч на суботу ўжо будуць выразна адчувацца жнівеньскія ноткі. Там сіноптыкі прагназуюць слабы туман і прахалоду — усяго 9—15 цяпла. Аднак удзень слупкі тэрмометраў зноў вернуцца да звыклых 23—29 градусаў са знакам «плюс». Невялікія дажджы пройдуць толькі ў асобных раёнах на паўночным усходзе краіны. Нядзеля на гэтым фоне чымсьці не выдзеліцца — усё тыя ж 24—29 цяпла з кароткачасовымі дажджамі ў асобных раёнах, аднак сутачны перапад тэмператур зменшыцца. У ноч на нядзелю будзе ўжо ад 12 да 17 градусаў. Не абыдзецца і без слабога туману.

Па папярэдніх прагнозах, у пачатку наступнага тыдня крыху пахаладае. Уначы слупкі тэрмометраў не апусцяцца ніжэй за 10—17 цяпла, а ўдзень яны пакажуць ад 21 да 29 градусаў. Кароткачасовыя дажджы магчымыя ў асобных раёнах.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Далучайцеся!

НАМАЛЯВАЦЬ ПАЎМАРАФОН

Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі абвясціла конкурс дзіцячых малюнкаў «ПраБег. Мінскі паўмарафон вачамі дзяцей».

Для ўдзелу ў конкурсе неабходна стварыць малюнак на бегавую і спартыўную тэматыку. Вітаецца выкарыстанне вывявы беларускіх лёгкаатлетаў і беларускіх славутасцяў. Арганізатары папярэджваюць, што на конкурс не прымаюцца калажы і аплікацыя, а таксама малюнкі, выкананыя ў праграмах для графічнага мадэлявання або дызайну. Малюнак павінен быць падпісаны з адваротнага боку або на асобным лістку. Неабходна ўказаць прозвішча, імя, узрост удзельніка, звесткі аб бацьках, паштовы адрас і, пры наяўнасці, e-mail.

Конкурс праходзіць у чатырох узроставых катэгорыях: дзеці з 3 да 6 гадоў, дзеці з 7 да 10 гадоў, дзеці з 11 да 15 гадоў і падлеткі з 16 да 18 гадоў. Работы прымаюцца да 20 жніўня па паштовым адрасе Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі: вул. Кірава, д. 8, корп. 6, каб. 708, 220030, г. Мінск.

З 21 жніўня да 1 верасня члены журы выберуць пераможцаў. Карыстальнікі сайта БФЛА таксама абяруць сваіх фаварытаў праз галасаванне. З 8 па 13 верасня адбудзецца выстаўка малюнкаў. Узнагароджанне пераможцаў пройдзе 13 верасня ў рамках Мінскага паўмарафону–2020. Аўтары найлепшых работ у кожнай катэгорыі атрымаюць спецыяльны прыз ад партнёраў і арганізатараў Мінскага паўмарафону. Малюнак абсалютнага пераможцы будзе размешчаны на білбордзе на самай ажыўленай вуліцы беларускай сталіцы з указаннем аўтара.

Нагадаем, што Мінскі паўмарафон–2020 адбудзецца 13 верасня. Плануецца, што ў самай вялікай бегавой падзеі краіны прымуць удзел 42 тысячы чалавек.

Валерыя СЦЯЦКО.

ВЫСОКААКУПНЫЯ ГРАНУЛЫ

Цэх па вытворчасці паліўных гранул, па сутнасці, з'яўляецца высокатэхналагічным прадпрыемствам. Сума прыцягнутых у праект інвестыцый склала больш за 5,1 мільёна еўра.

Будаўніцтва завода стала адным з этапаў выканання даручэння Прэзідэнта па забеспячэнні поўнай перапрацоўкі драўняных рэсурсаў унутры краіны, расказаў **міністр лясной гаспадаркі Віталь ДРОЖЖА** падчас адкрыцця прадпрыемства. У краіне плануецца дадаткова пабудаваць як мінімум шэсць аналагічных прадпрыемстваў.

Рашэнне аб іх узвядзенні ўжо прынята, падкрэсліў Віталь Дрожжа. «Работа ў гэтым кірунку актыўна вядзецца. Па шэрагу лясгасаў унесена перадаплата за абсталяванне. У найбліжэйшы час скончым усе праектныя работы, прыступім непасрэдна да будаўніцтва», — расказаў міністр.

У ЖЫТКАВІЧАХ АДКРЫЛІ ПЕЛЕТНЫ ЗАВОД

Па словах Віталя Дрожжы, гэта дакладны і перспектыўны кірунак. «Уся Еўропа арыентавана на памяншэнне спажывання вуглевадародаў. Паліўныя пелеты — гэта альтэрнатыўная біясыравіна, аднаўляльныя крыніцы. Гэта прадукцыя высокарэнтабельная, і створаныя ў нас пелетныя заводы рэнтабельныя. Ніякіх пытанняў з іх акупнасцю не павінна быць. Калі казаць пра эканамічны эфект, то за чэрвень першы мільён долараў мы ўжо зарабілі. Па годзе мы чакаем 15 мільёнаў валютнай выручкі», — падкрэсліў ён.

Дыслакацыі новых заводаў таксама ўзгоднены, у ліку іншых гэта Гомель, Старыя Дарогі, Асіповічы, Орша. Яны вызначаліся з прывязкай да сыравіннай зоны.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

РОБАТЫ... ГАРАДСКІЯ І СЕЛЬСКІЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ужо ствараюцца фільмы па ахове працы, камерцыйная рэклама, сацыяльныя ролікі. Паралельна рыхтуецца летапіс прадпрыемства, прысвечаны 60-й гадавіне газіфікацыі Віцебскай вобласці...

Далей — яшчэ цікавей. У гандлёвым аб'екце па рэалізацыі газавага абсталявання і запасных частак можна атрымаць кансультацыі ў віртуальнага прамоўтара. Нешта падобнае паказвалі ў папулярным фантастычным фільме «Машына часу». Ён не горш за чалавека растлумачыць патэнцыйным пакупнікам усю неабходную інфармацыю. Тут адразу можна заказаць тавары, якіх няма ў продажы ў момант наведвання, як і іх дастаўку, падключэнне, так бы, мовіць пад ключ усяго таго, што працуе на газе...

Старшыню Віцебскага аблвыканкама Мікалая Шарснёва ўразіў інтэлектуальны допуск у службовыя памяшканні, які распазнае чалавека візуальна. А яшчэ больш — «робат-медык»: інтэлектуальнае крэсла робіць псіхалагічнае тэсціраванне, вымярае ціск, тэмпературу, правярае, ці не знаходзіцца газавік у нецвярозым стане...

І агучвае, ці можа чалавек прыступаць да выканання службовых абавязкаў!Ну а пра робатаў, якія даглядаюць кароў, ведаюць ужо далёка за межамі Беларусі. Рэалізацыя алею дасць магчымасць атрымаць дадатковы прыбытак.

Прадэманстравалі і, бадай, самую перадавую ў краіне мадэрнізаваную аварыйна-дыспетчарскую службу. Між іншым, штогод спецыялізаванае падраздзяленне адпрацоўвае больш за 6000 аварыйных паведамленняў. З-за няспраўнасцяў газавыкарыстальнага абсталявання і парушэнняў правіл карыстання газам у побыце, адсутнасці актаў праверкі тэхнічнага стану дымавых і вентыляцыйных каналаў робіцца каля 700 адключэнняў ад сістэмы газазабеспячэння. Сярод паказаных — прыборы ўласнай распрацоўкі. Напрыклад, каб вымяраць узровень газу ў памяшканні. Аналагічныя прыстасаванні, ад якіх залежаць здароўе і жыццё чалавека, у ЕС каштуюць у разы больш, таму віцебскія распрацоўкі запатрабаваныя ва ўсёй краіне.

Кабінет тэарэтычнай падрыхтоўкі абсталяваны ўсім неабходным, у тым ліку шматфункцыянальным LED-экранам для правядзення ўсіх відаў інструктажу з адначасовай відэафіксацыяй...

А ў сельскагаспадарчым філіяле УП «Віцебскаблгаз», што ў вёсцы Мазалава, адкрыўся перспектыўны аб'ект сельскагаспадарчай вытворчасці — завод па перапрацоўцы алейных культур. Будаўніча-мантажныя работы правялі ў першым паўгоддзі 2020-га. Кошт праекта — 4,1 мільёна рублёў. Вытворчыя магутнасці невялічкага заводзіка дазваляюць перапрацоўваць да сямі тон насення рапсу ў суткі і вырабляць высакаякасны рапсавы алей. Макуха ж будзе выкарыстана на ўласныя патрэбы, што папоўніць існуючую кармавую базу сельскагаспадарчага філіяла газавай гаспадаркі.

Губернатар разлічвае і на тое, што ў хуткім часе тут пачнуць вырабляць алей для харчовых мэт і патрэб фармацэўтычнай галіны, медыцыны ў цэлым, а з сыравіны можна будзе рабіць і біяпаліва.

Цэнтр прыгажосці і здароўя, які адкрыўся разам з вытворчым аб'ектам, ужо стаў папулярным. Нават у горадзе ёсць ахвотныя сюды прыязджаць. Тут прапануюцца паслугі цырульні, робяць манікюр і педыкюр. Ёсць і швачка, якая рамантуе адзенне.

Вельмі папулярныя сталі заняткі ў трэнажорнай зале. Вопытны інструктар прыязджае з Віцебска, каб займацца з вясковымі жанчынамі.

Губернатар Мікалай Шарснёў лічыць, што менавіта такія прадпрыемствы павінны стаць візітоўкай развіцця эканомікі, сервісу, работы з кадрамі ў Беларусі. У «Віцебскаблгаз» вельмі шмат таленавітых работнікаў, творчых людзей, спартсменаў, усюды працуюць прафесіяналы. Губернатар нагадаў, што ў Мазалаве рэалізуецца рэспубліканскі праект стварэння вёскі будучыні. Аўтар ідэі — Прэзідэнт краіны.

Па інфраструктуры сацыяльных аб'ектаў населены пункт нічым не саступае вялікаму гораду. У прыватнасці, раней тут адчыніліся дзверы сучасных кавярні і крамы. На вуліцах стала вельмі ўтульна і стыльна. Жыллём працаўнікі вёскі таксама забяспечаны.

У выніку ўсіх пераўтварэнняў агракомплекс стаў жаданым месцам работы як для маладых, так і для больш вопытных спецыялістаў. У гаспадарцы літаральна чарга з ахвотных працаваць. Зарплаты даярак, земляробаў, механізатараў вельмі годныя. Так павінна быць усюды, каб на самай справе стварыць добрыя ўмовы для жыхароў глыбінкі, падкрэсліў губернатар.

Пётр Шершань дадаў, што ў яго падначаленых няма праблем з жыллём. Калі працуеш старанна, дык і зарабляеш добра, і маеш вельмі прывабны сацыяльны пакет. Да таго ж можна атрымаць дадатковыя бонусы за перамогу ў разнастайных конкурсах, напрыклад, па добраўпарадкаванні. Газавік падзяліўся планамі: пабудаваць новую ферму з робатамі, наладзіць больш глыбокую перапрацоўку рапсу. Мае ён ідэі і ў сферы лічбавізацыі.

Прысутныя на свае вочы ўпэўніліся, што набліжэнне вёскі да абласных цэнтраў і сталіцы — не прыгожыя словы, а рэальнасць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота Алега КЛІМОВІЧА.

Армія

ШАША ПАД КРЫЛАМІ

Лётчыкі пасадзілі самалёты на аўтадарогу

Адзін з першых аб'ектаў, які трапляе пад удар высокадакладнай зброі ў сучасным ваенным канфлікце, — гэта аэрадромы. Таму, каб размеркаваць і вывесці з-пад удару авіяцыю, выкарыстоўваюцца ўчасткі аўтадарог. Між іншым, іх і праектуюць для таго, каб можна было пераабсталяваць пад палявыя аэрадромы, на якіх можна абслугоўваць самалёты і верталёты. Гэты досвед ёсць у многіх краінах, сярод якіх і еўрапейскія — Германія, Швецыя.

Савецкая авіяцыя асвоіла гэты кірунак яшчэ ў лютым 1945 года — для баявых вылетаў выкарыстоўваліся нямецкія аўтабаны. У Беларускай ваеннай акрузе росквіт пасадак на аўтадарогах прыйшоўся на 60-я і 70-я гады. Але яны былі пастаўлены на паўзу разам са зніканнем СССР. З усёй постсавецкай прасторы яны захаваліся на вучэннях толькі ў ваенна-паветраных сіл Украіны.

Час ішоў, і ў 2007 годзе падрыхтоўка нашага лётнага складу да выкарыстання аўтадарог аднавілася. А ў 2016-м штурмавік Су-25 паспяхова сеў на аўтадарогу ўначы — упершыню на тэрыторыі былога Саюза.

Цяпер гэты складнік неад'емны падчас вучэнняў з удзелам авіяцыі і войскаў проціпаветранай абароны. Ды і экіпажаў, якія ўмеюць гэта рабіць, з кожным годам усё больш. Свае навыкі вайскоўцы 116-й гвардзейскай штурмавой авіяцыйнай базы і 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы ВПС і войскаў ППА паказалі падчас аператыўна-тактычнага вучэння.

Самалёты МіГ-29, Су-25, Як-130 і Л-39 паспяхова селі на аэрадромны ўчастак дарогі аўтамабільнай трасы М1 Мінск—Брэст каля вёскі Чамялы. Там яны падрыхтаваліся да паўторнага вылету і нанеслі ўмоўны авіяцыйны ўдар па наземных цэлях на аэрадроме Ружаны. Перад тым, паводле легенды, пазіцыі на шашы атакавала дыверсійна-разведвальная група праціўніка. Задачы па прыкрыцці раёна палётаў і ўчастка дарогі ад сродкаў паветранай атакі праціўніка выконвалі знішчальнікі Су-30СМ і зенітныя ракетныя комплексы Тор-М2. Верталёты Мі-24 і Мі-8МТВ-5 50-й змешанай авіяцыйнай базы супрацьстаялі дзеянням незаконных узброеных фарміраванняў. Медыцынскі модуль апошняга забраў з поля бою ўмоўнага параненага.

— Быў адпрацаваны шэраг тактычных задач, — зазначыў камандуючы ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны генерал-маёр Ігар Голуб, пад кіраўніцтвам якога і праводзіцца аператыўна-тактычнае вучэнне. — Разлікі па ліквідацыі дыверсійна-разведвальных груп праціўніка працавалі як з зямлі, так і з паветра. Задачы выкананы, умоўны праціўнік быў выціснуты. Пасадку на дарогу выканалі самалёты, якія праводзілі расчыстку паветранай прасторы. Зараз да самалётаў падвешваюцца боепрыпасы і іх запраўляюць палівам для выканання далейшых задач. Змешаная ўдарная група, якая складаецца з чатырох самалётаў, атрымлівае каардынаты стацыянарнай цэлі для яе паражэння. Мы мусім адпрацаваць спецыяльныя тактычныя прыёмы, якія павысяць патэнцыял авіяцыі. Уплыў на аэрадынаміку робіць і густы лес.

Адметнасць гэтых вучэнняў — тое, што пасадку на аўтадарогу ўпершыню выканаў курсант 4-га курса авіяцыйнага факультэта Ваеннай акадэміі. Гэта быў радавы Арцём Чарніцкі. Зрабіў ён тое на вучэбна-трэніровачным самалёце Л-39.

— Палёт аказаўся вельмі хвалюючым, — дзеліцца вайсковец. — Яго можна параўнаць толькі з самым першым у жыцці. Поспех любога палёту закладваецца на зямлі, і лётнае майстэрства складаецца з дзвюх частак, як і іншыя дысцыпліны, — тэорыі і практыкі. Тэорыі нас вучаць выкладчыкі са шматгадовым практычным стажам. І як бачым, узровень падрыхтоўкі дазваляе выканаць такую складаную задачу, як пасадку на аэрадромны ўчастак дарогі. Калі саджаеш самалёт на аэрадром, ты ведаеш кожны арыенцір, дапамагаюць і тэхнічныя сродкі. На дарозе гэтага няма. Мясцовасць цалкам незнаёмая, вакол толькі лес. Таму трэба быць максімальна сканцэнтраваным, а кожнае дзеянне — гранічна вывераным.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.
Івацэвіцкі раён.

ПОП СВАЁ, А ЧОРТ СВАЁ

...На вакзал Ганна ледзь прыплялася — рукі, здавалася, адарвуцца ад непад'ёмных сумак — ледзьве ўсцягнула іх у вагон. «І на халеру я столькі падручнікаў з сабой цягнула, столькі адзення брала, — дакарала сама сябе. — Не спатрэбілася ж амаль нічога».

Аднак настрой быў паганы не столькі з-за сумак. Найболей даймала тое, што яна, студэнтка-завочніца чацвёртага курса педуніверсітэта і амаль выдатніца, з гэтай, чарговай сесіі вярталася «з хвастом»... Зноў жа — праз сваю дурату: замест таго, каб рыхтавацца да апошняга экзамену ці хоць напярэдадні проста паспаць, ударылася ў гулі, да позняга святкавала юбілей сяброўкі...

Факт, што цяпер яе суцяшала хіба адно: нейкія шэсць гадзін у дарозе і яна дома — абдымае сваіх дзяцей, мужа, вяртаецца да прывычных спраў. А пакуль, як здавалася, можна адпачыць, хаця...

Сваё месца ў плацкартным вагоне насупраць яе займала нейкая жанчына, не першай маладосці, але з такімі жывымі цікаўнымі вачанятамі...

Толькі глянуўшы на іх, Ганна зразумела, што падрамаць не атрымаецца — дастане размовамі.

І сапраўды: цягнік крануцца не паспеў, як жанчына залапатала:

— Бачу, ты з цяжкімі сумкамі... З адпачынку, відаць?

— Можна і так сказаць, — усміхнулася Ганна. — Амаль месяц дома не была.

— А чаму ж тады кіслая?

— Ды з «хвастом» вяртаюся...

— Авоечкі! Як жа так?

— Сама не разумею... Загулялася...

— Вось бяда дык бяда! — паспачувала спадарожніца. — А яшчэ як муж дазнаецца....

— Ды ён ужо... Я пазваніла.

— Ну і як? Што сказаў?

— Сказаў — хай большай бяды не будзе, а з гэтай справімся.

— Што? Ён так і сказаў?! Во гэта мужчына! Гэта — чалавек!.. Не тое, што іншыя... Мой далібог бы галаву адкруціў... А твой — мае рацыю: медыцына цяпер моцная. Абы не спазніцца...

— Праз месяц сказалі прыехаць... Толькі пры чым тут медыцына?

— Дык «хвост» жа — гэта залёт?

— Які залёт?! Студэнтка я! Экзамен заваліла — вось і «хвост»... А вы што падумалі? Як вам не сорамна?

...Жанчыне і сапраўды, мусіць, няёмка было, бо за ўсю дарогу яна не сказала болей ні слова.

Анатоль ПАЛЫНСКІ,
г. Беразіно.

ЯК КЛІЧУЦЬ, ТАК І АДКЛІКАЮЦЦА

Апынуцца ў патрэбным месцы ў патрэбны час пашчасціць не кожнаму. Ірына, мая блізкая прыяцелька, якраз з такіх. Ну мяркуйце самі: спачатку яна трапіла на чужое вяселле і там знайшла сабе мужа, потым, у радзільні, падзялілася грудным малаком з суседкай па палаце і займела блізкую сяброўку, а праз яе мужа — і новую работу, аб якой жанчыны хіба што мараць. Загінайце пальцы: побач з домам і садком — гэта раз, з добрай зарплатай — два, па спецыяльнасці — тры, у досыць дружным жаночым калектыве — чатыры...

А далей — амаль па Караткевічу: каб работа мёдам не здавалася, за начальніка ў іх быў нейкі недарэка... Росту ў чалавека — метра паўтара ў падскоку, а форсу — без фігі не да носа. Увесь час стараўся паказаць, хто тут хто: ледзь не кожны дзень нарады збіраў, на гадзіну «пяцімінуткі» расцягваў, перад кожнай з работніц «задачы ставіў» — на дзень, на тыдзень (як быццам без гэтага яны не ведалі б, што рабіць), а ўжо дысцыпліну трымаў — як, мусіць, ніхто. Быў час — спецыяльны журнал завёў, у якім кожны спецыяліст пазначаў, а каторай гадзіне прыйшоў на работу, куды адлучаўся па службовых справах (з указаннем часу ад'езду і часу прыезду), куды адпрошваўся... Калі, напрыклад, да доктара, то павінен быў запісаць яго прозвішча і нумар паліклінікі, каб гэта можна было праверыць...

Карацей, начальніка тога звалі Фама і, відаць, недарэмна: не давяраў ён сваім падначаленым... А спрабавалі казаць — не чуў.

Вось тады з лёгкай рукі адной гумарысткі ў журнале і сталі з'яўляцца запісы накшталт: дзевяць гадзін — прыйшла на работу, дзевяць гадзін пятнаццаць хвілін — пайшла ў прыбіральню, дзевяць гадзін дваццаць хвілін — адтуль вярнулася, што, вядома ж, рэзала вочы.

Мусіць, таму кідкае слова «прыбіральня» жанчыны «засакрэцілі»: сталі пісаць: «Пайшла да... Фамы Пятровіча»... «Прыйшла ад Фамы Пятровіча»... То-бок да начальніка і ад начальніка?

...Як вядома, над кожным з іх, гэтых невялікіх, ёсць начальнікі большыя, якія час ад часу наведваюць «нізавыя падраздзяленні».

Вось і ў той дружны калектыў завітаў «шэфаў шэф», генеральны дырэктар.

Удвух яны спачатку пасядзелі ў кабінеце ў Пятровіча, потым прайшліся па тэрыторыі, па майстэрнях, завіталі і да жанчын, дзе гаспадар хацеў пахваліцца навідзеннем парадку — падаў журнал.

Госць разгарнуў яго, уголас прачытаў колькі верхніх радкоў аб тым, хто куды адлучаўся. А потым, зачапіўшыся за шматлікія «... пайшла да Фамы Пятровіча — прыйшла ад Фамы Пятровіча» спытаў:

— Слухай, а чаго ты іх выклікаеш? Ды яшчэ раз за разам... Ты ж людзям працаваць не даеш...

Фама паспрабаваў быў пярэчыць, што выклікае зусім не часта, што гэтыя запісы трэба праверыць...

Аб чым яшчэ (і ўжо з вока на вока) гаварылі візіцёры, жанчыны не чулі. Яны ледзь дачакаліся, пакуль за начальствам зачыняцца дзверы, пакуль яно трохі адыдзецца, а потым, што называецца, пад сталы палезлі ад рогату...

І назаўтра ў іх радасць была, бо журнала, які напсаваў ім столькі крыві, на месцы не аказалася, ніякіх праверак і разборак з-за яго таксама не было.

А. Ермалюк,
г. Пінск.

САРОКА САРОКУ БАЧЫЦЬ ЗДАЛЁКУ

Добрая ўсё-такі штука — інтэрнэт. Некалі мы, старыя, ганьбілі яго, потым, пакрысе, сталі цікавіцца ды асвойваць, каб урэшце прызнаць, што гэта ж проста цуд! Радня, дапусцім, недзе за светам, за тысячы вёрст, а ты сабе сядзіш на канапе і з ёй размаўляеш, бачышся... Ды што там — нават часу не заўважаеш, на гадзіннік не глядзіш — не баішся, што гэта ўляціць у капеечку...

Да таго ж — любую падказку ў інтэрнэце знойдзеш, розныя крыжаванкі ды гульні для прафілактыкі склерозу, анекдоты для падняцца тонусу. Ну сапраўды, нешта пачытаеш-паглядзіш, пасмяешся, а потым яшчэ і абмяркуеш, бо серыялы ўжо не модна...

Дык вось неяк зайшла да нас суседка Анюта. Яна таксама ўсё жыццё ў вёсцы пражыла, нам ёсць аб чым пагаманіць. Але ж тут быў ТікТок адкрыты, згледзела Аня, як кошка талерачку ссоўвае са стала, каб тая разбілася, і як зарагоча... Кажа: «Мая нявестка вось так рабіла».

З гэтага, як здагадаліся, і пачалася чарговая «вясёлая і праўдзівая гісторыя».

«Ажаніўся, значыць, мой сын, — расказвала Анюта, — прывёз дадому нявестку — гарадскую, але ж ласкавую-ласкавую. Ну хоць ты да раны яе прылажы: кампліменты вакол рассыпае, усё хваліць, за работу хапаецца... І родных сваіх у госці прывозіць. Мне што, — я не супраць, бо каўбаса з вяндлінкай у хаце нязводныя, масла з сырам таксама. І гародніны — хоць на градах, хоць у слоіках недзе ў склепе — да гіблоты, як той казаў... Ёсць чым людзей частаваць.

Але ж пасля гэтага і посуду... «Я памыю!» — бярэцца Танечка. Ну і памый, калі хочаш... Хто ж тут будзе пярэчыць? Тым больш што ў сына свае клопаты (ён, дзякуй богу, сам работу бачыць, загадваць нічога не трэба). У мяне таксама — свінні, каробка, город. Ды і гасцей з пустымі сумкамі ў горад не выправіш — палажыць нешта трэба...

Значыць, ідзе мая нявестачка посуд мыць. І з кухні следам то «дзынь», то «бразь»: кожны раз хоць нешта ды паб'ецца... Гляджу, ужо сіротамі, а не камплектамі ў секцыі крыштальныя фужэры стаяць (першымі пабіліся самыя прыгожыя — на тонкай ножцы). І сервіз сталовы ўжо не сервіз, а так — горка талерак (як для вялікай кампаніі дык і на стол непрыемна ставіць)...

Шкада іх, вядома ж, бо за кожным наборам памяць: не сама ж іх купляла — блізкія людзі дарылі...

І, што крыўдна, не скажаш, што ў нявесткі рукі крывыя, што яна калі чарку лішнюю п'е. Тады што?

Стала я неяк у кухні ля дзвярэй і назіраю. Бачу, гаспадынька мая кілішак на край стала паставіла, а потым — быццам незнарок — локцікам яго, на аскалачкі...

Азірнулася, згледзела мяне — зачырванелася... Я ж зрабіла выгляд, што нічога такога не заўважыла. Кажу ёй: «Посуд на шчасце б'ецца!»

А яна ж, відаць, чакала, што я яе з кухні адпраўлю, не даверу болей пасудак мыць...

Ага, якраз: не такая ў цябе свякроў.

Каб пераканаць, я да наступнага прыезду як след падрыхтавалася: сабрала колькі каструль з патэльнямі, растапіла пліту, трохі ссунула кругі — патрымала посуд, каб закапціўся.

А тут у выхадныя і госці мае. Паабедалі, пагаварылі, а потым я і кажу, што талеркі сёння мыю сама (у нявесткі, бачу, аж вочкі заблішчэлі: ура, маўляў, дамаглася!). Я ж, «не заўважаючы», гну сваё: «А ты, дачушка, пачысці каструлі з патэльнямі. І глядзі ж, спаласні, як след... Саша табе вадзічкі наносіць».

...Цяжкавата тады Тані прыйшлося — папрацавала, бедная. Але ж не марна: пасля тога жалезнага ды чыгуннага посуду шкляны з яе ручак больш ніколі не падаў. Мы з ёй паразумеліся, што важна — без ніякіх сварак».

Любоў Чыгрынава,
г. Мінск.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж. *Гісторыі (паводле слоўніка эпітэтаў беларускай літаратурнай мовы) бываюць абсурдныя, амурныя, анекдатычныя, банальныя, дзівосныя, ідыёцкія, камічныя, кранальныя, небывалыя, павучальныя, пацешныя, скандальныя, трагікамічныя... Усяго — ці паверыце? — каля сотні слоў!*

І яшчэ адна лічба (мо такая ж неверагодная): газета «Звязда» іх збірае амаль дваццаць гадоў!

Удзячная справа! А таму — далучайцеся, гэта значыць пішыце!

Калі ласка, са зваротным адрасам і (пажадана) нумарам тэлефона для аператыўнай сувязі.

Неасабісты суб'ектыў

Ступень адказнасці

Яна, здараецца, нашмат вышэйшая, чым мы думаем

ПЕКЛА на зямлі здарылася ў аўторак зусім недалёка ад Біблейскіх мясцін. Сонечны зялёны Бейрут ператварыўся ў груду развалін. Больш за сто трыццаць чалавек загінула (і гэта лічба, напэўна, павялічыцца, бо яшчэ не ўсіх дасталі з-пад завалаў). Больш за пяць тысяч параненa, больш за трыста тысяч засталося без даху над галавой. Зерня ў сталіцы Лівана засталося самае большае на два тыдні. Горад аб'яўлены зонай бедства. Выбухі, якія прагрымелі ў бейруцкім порце ў аўторак і якія пачулі нават на Кіпры, што за дзвесце сорак кіламетраў, па магутнасці, як падлічылі эксперты, склалі дзясятую частку атамнай бомбы, што амерыканцы семдзесят пяць гадоў таму скінулі на Хірасіму...

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **1 октября 2020 г. в 10.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 28 сентября 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **1 октября 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»:

белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000,
российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000
в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел./факс: (017) 398-05-41.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

сообщает о переносе проведения открытого аукциона с 28.08.2020 на 04.09.2020

Лот № 1: Трактор МТЗ 922.3, 2009 г. в., р/з ТА-6 7228 (складской № по бух. учету 55583251). *Нач. цена без НДС: 4 100,28 бел. руб.*

Лот № 2: Прицеп специальный самосвал MAZ-857100-(024), 2007 г. в., р/з 5003 АА-6 (складской № по бух. учету 55581969). *Нач. цена без НДС: 1 563,81 бел. руб.*

Лот № 3: Грузовой самосвал MAZ-555132-225, 2009 г. в., р/з АВ 0373-6 (складской № по бух. учету 83206). *Нач. цена без НДС: 7 462,86 бел. руб.*

Лот № 4: Бетоносмеситель полуприцепной МОАЗ-8403, 2012 г.в., (складской № по бух. учету 1051сТ). *Нач. цена без НДС: 3 719,89 бел. руб.*

Аукцион состоится 04 сентября 2020 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте ino.by. Информация ранее была размещена в номере газеты «Звязда» от 23.07.2020

Доп. информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56; эл. почта: Mogilev@ino.by

УНП 190055182.



СКАНВОРД

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: Фатограф. Адклад. Ілюмінатар. Акіян. Атам. Аправа. Карэта. Рай. Пірат. Чага. Каскад. Ода. Аліга-тар. **ПА ВЕРТЫКАЛІ:** Цягліца. Ордэн. Рулет. Фёдар. Юніёр. Ігнат. Амар. Атава. Тарка. Майка. Пах. Капейка. Эра. Такі. Час. Града. Кот. Дар.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, *г. Мінск.*

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.34	20.55	15.21
Віцебск —	5.19	20.50	15.31
Магілёў —	5.24	20.45	15.21
Гомель —	5.27	20.36	15.09
Гродна —	5.50	21.10	15.20
Брэст —	5.57	21.04	15.07

Месяц

Поўня 3 жніўня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Алімпіяды, Ганны, Іраіды, Аляксандра, Макара.*
К. *Дароты, Клаўдзіі, Кандрата, Каятана, Сікста.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

7 ЖНІЎНЯ

У краіне

1910 год — нарадзіўся Генадзь Іванавіч Цітовіч, беларускі этнамузыказнавец, дзеяч харавога мастацтва, дырыжор, народны артыст Беларусі, народны артыст СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

У гэты ж дзень нарадзіўся Якуб (Якаў Сідаравіч) Ермаловіч, беларускі пісьменнік. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцяў «Над Бярозай», «Душа чалавека», «Родная зямля», «След на зямлі», «Сіняя птушка» і іншых.

1940 год — зацверджана ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларускай ССР» (прысвойвалася да 23 лістапада 1988-га).

1950 год — нарадзіўся Аляксандр Аляксандравіч Карпаў, кінарэжысёр, сцэнарыст, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

2005 год — у вёсцы Пустынкі Мсціслаўскага раёна адбылося асвячэнне адноўленага храма Нараджэння Найсвяцейшай Багародзіцы з удзелам Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.

У свеце

1875 год — нарадзіўся Мікалай Максімавіч Тулайкаў, расійскі вучоны — аграном і глебазнавец, акадэмік, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Расіі. Быў неабгрунтавана рэпрэсаваны, рэабілітаваны пасмяротна.

1945 год — нарадзіўся Аляксандр Барысавіч Журбін, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі, аўтар першай рускай рок-оперы «Арфей і Эўрыдыка» (1975).

1955 год — нарадзіўся Уладзімір Георгіевіч Сарокін, рускі пісьменнік, сцэнарыст і драматург, мастак. Адзін з найбольш яркіх прадстаўнікоў канцэптуалізму і соц-арту ў рускай літаратуры.

1960 год — нарадзіўся Дэвід Духоўны, амерыканскі акцёр, сцэнарыст, прадзюсар, рэжысёр, пісьменнік і музыкант. Двухразовы ўладальнік прэміі «Залаты глобус» (1997, 2008).

2005 год — каля берагоў Камчаткі паспяхова завершана выратавальная аперацыя па падняцці на паверхню расійскага глыбакаводнага апарата АС-28 з сямю членамі экіпажа.

Так гаварыў...

ТЭАДОР РУЗВЕЛЬТ:

«Вялікай нацыяй нас робіць не багацце, а тое, як мы карыстаемся ім».

УСМІХНЕМСЯ

На рынку:

— Што гэта ў вас за яблыкі? Чаму яны такія розныя?

— А чаму ты прыгажуня, а я не?

— Ну навошта так старацца быць маладой?

— Ну, па-першае, я прывыкла...

— Сынок, вы думаеце з Марынкай дзіця заводзіць?

— Ой, мама, я пра гэта кожную ноч думаю.

— А Марынка?

— А ў Марынкі ад гэтага нават кожны раз галава баліць. Яна кажа, што ёй на рабоце пра гэта лепш думаецца.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2534.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 жніўня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

7 жніўня 2020 г. № 29 (565)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ТЭМА ТЫДНЯ

Жыві і квітней, Беларусь! Наша спадчына

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

КАБ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

ЗАХАВАННЕ гісторыка-культурных каштоўнасцяў краіны — працэс сістэмны і няспынны, які доўжыцца не адзін год. Затое і плён мае відавочны. За чвэрць стагоддзя незалежнасці Беларусі амаль 600 аб'ектаў архітэктуры былі адрэстаўраваныя, адноўленыя і вернутыя ў сучасны культурны і турыстычны кантэкст, шмат у чым дзякуючы дзяржпраграме «Замкі Беларусі», якая ажыццяўлялася ў 2012—2016 гадах, а ў 2016—2020-м прадоўжылася як частка праграмы «Культура Беларусі».

У чэрвені бягучага года кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне, паводле якога Міністэрства культуры атрымала больш за 3 мільёны рублёў са сродкаў фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва. Гэтая дапамога ў захаванні і вяртанні культурнай спадчыны адрасная — для рэстаўрацыі сядзібна-паркавага ансамблю ў вёсцы Закозель Драгічынскага раёна, Гальшанскага і Крэўскага палацаў, касцёла ў Мсціславе, што ўваходзіць у склад былога калегіума езуітаў (касцёл і манастырскі корпус сярэдзіны XVIII стагоддзя).

Так, сёлета спецыялісты прадпрыемства «Белрэстаўрацыя» працягваюць кансервацыю і частковае аднаўленне захаваных фрагментаў **Крэўскага палаца.** Дзякуючы фінансаванню з прэзідэнцкага фонду — а гэта амаль мільён рублёў — цяпер па сакрэтных рэцэптах і праверaных часам тэхналогіях аднаўляецца кладка на 85-метровым паўночна-ўсходнім участку сцяны, прылеглай да адзінай захаванай вежы — Вялікай Княжацкай. Работа няпростая, навукова абгрунтаваная і вывераная да дробязяў, у выніку шэрагу прычын выконваецца ўручную — практычна як і пры ўзвядзенні палаца 700 гадоў таму. У далейшай перспектыве, адзначаюць у Смаргонскім райвыканкаме, плануецца аднавіць баявыя галерэі, наноў пабудаваць уязную браму ў палац, а тады ўжо гаварыць пра падрыхтоўку і адкрыццё музейнай экспазіцыі.

Не спыняюцца работы і ў **Гальшанскім палацы,** на адраджэнне якога ў 2020 годзе са сродкаў згаданага фонду выдзелена амаль 500 тысяч беларускіх рублёў. Паводле праекта, у якім дэталёва распісаная канцэпцыя кожнага паверха, у паўночнай вежы — адзінай захаванай з чатырох — вонкавыя работы ўжо завершаны. Цяпер ідзе музеефікацыя: рэстаўратары ўзнаўляюць дакладна па колішніх узорах столь, падлогу і камін. У экспазіцыі будуць прадстаўлены славутая гальшанская кафля і іншыя арыгінальныя дэталі інтэр'еру, што захаваліся ад былых уладароў замка — княжацкага роду Сапег. З падвала, як мяркуецца, можна будзе праз шкляную падлогу ўбачыць гальшанскі скарб, а з аглядной пляцоўкі на верхнім ярусе — агледзець рэшткі ўсяго архітэктурнага шэдэўра XVII стагоддзя і маляўнічыя краявіды наваколля, дзе шмат гадоў праходзіць вядомы фестываль сярэдневяковай культуры «Гальшанскі замак».

стар. 4

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

Фінансы, вытворчасць, адукацыя

На трэцяй пазачарговай сесіі сенатары разгледзелі пытанні, як кажуць, ад жыцця

Фота БелТА.

Цэнтральнай тэмай парадку дня стала сумеснае пасяджэнне Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу для заслухоўвання штогадовага Паслання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і парламенту.

Спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА акцэнтавала ўвагу на тым, што пасланне — гэта арыенцір у рабоце для ўсіх: дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, суб'ектаў гаспадарання і кожнага грамадзяніна. Яго галоўны адрасат — народ Беларусі — адзіная крыніца дзяржаўнай улады і носьбіт суверэнітэту. Менавіта яму ў найбліжэйшы час давядзецца абіраць Прэзідэнта краіны, па сутнасці — вызначаць свой лёс і будучыню нашай незалежнай краіны. (Больш падрабязна аб Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і парламенту чытайце ў нумары «Звязды» за 5 жніўня.)

Акрамя гэтага, быў разгледжаны цэлы шэраг пытанняў, якія датычыліся кадравых прызначэнняў і ратыфікацыі міжнародных дагавораў і пагадненняў.

стар. 2

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Блізкая ўлада

Што хацелі ад сенатараў вяскоўцы і гараджане? стар. 2

Абмеркавалі дэпутаты

Каб не ўзнікала дэфіцыту тавараў. стар. 3

Было — стала

У атачэнні архітэктурнай вытанчанасці. стар. 4

Апошні «герой»

Косаўскі палац адбудоўваюць з руін. стар. 13

З палону на п'едэстал

Што рабіў у Шчучыне Шарль дэ Голь? стар. 14

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

ПРАБЛЕМЫ ЎЗЯТЫ НА КАНТРОЛЬ

У жыхароў вуліцы Вялікіх Надзей у горадзе Белаазёрску, што на Брэстчыне, з'явілася ўпэўненасць, што сёлета іх вуліца будзе добраўпарадкавана, а тыя, хто жыве на вуліцы Шасэйнай, дачакаюцца з'яўлення веладарожкі.

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ** паабяцаў мясцовым жыхарам падчас сустрэч з працоўнымі калектывамі УП «Вердзімар» і ААТ «Гандлёвы цэнтр «Надзея» ў Белаазёрску ўзяць гэтыя і іншыя пытанні на кантроль.

Таксама сенатар расказаў удзельнікам сустрэчы пра кірункі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і прыярытэтныя задачы, вызначаныя кіраўніком дзяржавы, адзначыў калектывы, якія здолелі ў няпростых умовах жорсткай канкурэнцыі забяспечыць прыбытковую дзейнасць.

РОЛЯ РЭГІЯНАЛЬНЫХ СМІ БУДЗЕ ЎЗРАСТАЦЬ

У Паставах, што на Віцебшчыне, на сустрэчы з сенатарам Аленай ПАНЦЮХОВАЙ мясцовыя журналісты агучылі тое, што хвалюе рэдакцыйныя калектывы.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар тэлерадыёкампаніі «Віцебск» Алена Панцюхова сустрэлася з калектывамі рэдакцыі праграмы радыёвяшчання «Пастаўскае мясцовае радыё» і праграмы тэлебачання «Паставы-ТБ», рэдакцыяй раённай газеты «Пастаўскі край», работнікамі ўнітарнага прадпрыемства «Пастаўская друкарня».

У цэнтры ўвагі падчас сустрэчы былі актуальныя пытанні, з якімі цяпер сутыкаюцца рэгіянальныя журналісты. Акрамя таго, прагучала просьба дапамагчы ў набыцці правоў на аўдыявізуальныя творы. Сенатар паабяцала аказаць садзейнічанне ў вырашэнні гэтага пытання.

ВЯСКОЎЦЫ ПРОСЯЦЬ ДАРОГУ

Сенатар мае намер унесці прапанову па рамонце аднаго з участкаў дарогі ў Віцебскай вобласці ў адпаведную дзяржпраграму.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, генеральны дырэктар камунальнага праектна-рамонтна-будаўнічага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблдарбуд» Уладзімір МАЦВЕЕЎ наведаў Шаркаўшчынскі раён Віцебскай вобласці.

Жыхары вёсак Прамяны і Сталіца звярнуліся да сенатара з просьбай пасадзейнічаць у рамонце ўчастка шашы Шаркаўшчына—Германавічы—Латышы Н-3901. Член Савета Рэспублікі вырашыў прапанаваць уключыць рамонт гэтага ўчастка дарогі ў дзяржпраграму «Дарогі Беларусі 2021—2025». Зварот вяскоўцаў будзе знаходзіцца на кантролі.

УВАГА ДА МОЛАДЗІ

Падзячныя лісты самым ініцыятыўным прадстаўнікам маладога пакалення Мазырскага раёна Гомельшчыны ўручыў сенатар.

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» Алег СЛІНЬКО сустрэўся з прадстаўнікамі працоўнай моладзі Мазыра і раёна, маладзёжным парламентам, створаным пры раённым Савеце дэпутатаў.

Атрымаўся адкрыты і рознабаковы дыялог. На сустрэчы абмяркоўвалі пытанні развіцця раёна, казалі пра дасягненні ў сельскагаспадарчай галіне, у сферах прамысловасці, будаўніцтва і гандлю, пра маладзёжную палітыку.

У сваім звароце да прысутных парламентарый адзначыў: «Для нашай моладзі ў мірнай і стабільнай краіне, дзе захаваны духоўныя каштоўнасці і нацыянальная культура, ёсць шмат магчымасцяў рэалізаваць сябе. Сёння менавіта мы з вамі, грамадзяне Беларусі, вызначаем сваю будучыню. Важна захаваць гэтую стабільнасць і перадаць яе сваім дзецям».

Фінансы, вытворчасць, адукацыя

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Старшыня Праўлення Нацбанка Павел КАЛАУР прадставіў фінансістаў-экспертаў, якія ўказам кіраўніка дзяржавы зацверджаны ў якасці членаў Праўлення Нацыянальнага банка. Працэдура абнаўлення складу прадугледжвае ўзгадненне з членамі Савета Рэспублікі прапанаваных кандыдатур. Па сутнасці, сенатары ў межах дзеючага заканадаўства і сваіх канстытуцыйных паўнамоцтваў завяршаюць фарміраванне складу Праўлення Нацбанка.

Кожны з трох кандыдатаў не навічок у банкаўска-фінансавай сферы, мае вялікі вопыт і адказвае за свой кірунак дзейнасці: ад забеспячэння фінансавай стабільнасці грашова-крэдытнай сферы да кіравання золатавалютнымі рэзервамі краіны.

— Быць членам Праўлення Нацбанка — вельмі адказная місія і новы выклік для дзяржаўнага служачага, — упэўнена **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ,** кажучы пра кандыдатуру Дзяніса Гарагляда, які ўзначальвае галоўнае ўпраўленне аперацый на фінансавых рынках. — У яго кампетэнцыю ўваходзіць вырашэнне пытанняў, звязаных з правядзеннем аперацый на ўнутраным і знешнім фінансавых рынках, рэгуляваннем ліквіднасці банкаўскай сістэмы, фарміраваннем і кіраваннем золатавалютнымі рэзервамі.

Яшчэ адзін спецыяліст фінансавай сферы — Алена Машніна, якая цяпер узначальвае галоўнае ўпраўленне банкаўскага нагляду фінансавага рэгулятара дзяржавы. Пры яе ўдзеле міжнароднымі аўдытарскімі кампаніямі была праведзена комплексная ацэнка якасці актываў усіх банкаў краіны. Таксама яна курыравала работу па лініі Групы распрацоўкі фінансавых мер барацьбы з адмываннем грошай — гэта міжурадавы орган, які распрацоўвае і ўкараняе стандарты па барацьбе з адмываннем грошай і фінансаваннем тэрарызму. Дарэчы, Беларусь, згодна з ацэнкай міжнародных экспертаў, цалкам адпавядае гэтым стандартам.

Начальнік галоўнага ўпраўлення эканамічнага аналізу Дзмітрый Мурын курыруе два адчувальныя блокі пытанняў: забеспячэнне цэнавай стабільнасці і павышэнне даверу да нацыянальнай валюты. Як вядома, апошнія гады інфляцыя ў Беларусі трымаецца на мінімальным узроўні, а так званая дэдалярызацыя — працэс не аднамомантны. Але поспехі ў дадзеным кірунку ёсць. У гэтым заслуга і названага кандыдата, упэўнена старшыня профільнай камісіі Савета Рэспублікі. Таццяна Рунец адзначыла, што на пасяджэнні камісіі ўжо заслухалі ўсіх кандыдатаў, яны адказалі на ўсе пытанні сенатараў. Адбылося жывое абмеркаванне актуальных пытанняў грашова-крэдытнай сферы, якіх, калі лічыць па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб, назбіралася нямала, паведаміла яна і рэкамендавала даць згоду на прызначэнне Дзмітрыя Гарагляда, Алены Машніной і Дзмітрыя Мурына членамі Праўлення Нацбанка. Сенатары пагадзіліся з гэтай прапановай.

Фота Бел ТА.

Другі грунтоўны блок разгледжаных на пазачарговай сесіі пытанняў датычыўся шэрагу законапраектаў па ратыфікацыі і далучэнні да міжнародных пагадненняў. Напрыклад, аб далучэнні нашай краіны да Пратакола аб абмене інфармацыяй у электронным выглядзе паміж дзяржавамі — удзельніцамі СНД для ажыццяўлення падатковага адміністравання.

— Мы працягваем работу над законапраектамі, якія ідуць ад жыцця і дапамагаюць паляпшаць якасць жыцця насельніцтва: робім акцэнт на законапраекты эканамічнай скіраванасці, — звярнуў увагу на актуальнасць тэматыкі ў размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.** — У прыватнасці, адзін з законапраектаў прысвечаны асаблівасцям ажыццяўлення аперацый з каштоўнымі металамі і камянямі ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. Важны законапраект, які дазволіць сфарміраваць адпаведныя механізмы ўзаемадзеяння краін, што ўваходзяць у ЕАЭС, як у гандлі гэтымі рэчамі, так і ў некаторых іншых аспектах.

Таксама падчас пасяджэння быў разгледжаны законапраект, які дазволіць пашырыць экспарт адукацыйных паслуг.

— Мы пагаджаемся з Выканаўчай праграмай паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Егіпта аб супрацоўніцтве ў галіне вышэйшай адукацыі і паслядыпломнай адукацыі, — растлумачыў старшыня профільнай камісіі. Ён нагадаў, што гэтая праграма была падпісана на ўзроўні міністраў падчас візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Каір сёлета ў лютым. Сяргей Рачкоў адзначыў, што адукацыйны кірунак з'яўляецца адным з найважнейшых у супрацоўніцтве паміж Егіптам і нашай краінай.

— У нас тут ёсць сур'ёзныя зрухі — мы стварылі сумесны інжынерны факультэт паміж БНТУ і Табінскім металургічным інстытутам. За апошнія пяць гадоў колькасць студэнтаў — грамадзян Егіпта, якія навучаюцца ў нашай краіне, павялічылася прыкладна ў пяць разоў. Рэалізацыя Выканаўчай праграмы дазволіць бакам абменьвацца як студэнтамі-магістрантамі, так і аспірантамі, — падкрэсліў ён. — Мы разлічваем, што зможам ва ўзаемадзеянні з егіпецкім бокам узмацніць падрыхтоўку арабістаў і спецыялістаў, якія могуць ажыццяўляць сінхронны пераклад як з арабскай мовы, так і з рускай на арабскую.

На сёння ў адукацыйнай сферы егіпцяне зацікаўлены ў павышэнні ўзроўню ведаў па IT-спецыяльнасцях, медыцыне, фармакалогіі і турызме, растлумачыў «МС» Сяргей Рачкоў. Што датычыцца супрацоўніцтва з БНТУ, то тут маецца на ўвазе кадравая падтрымка прамысловых аб'ектаў.

— У Егіпце працуюць зборачныя вытворчасці Мінскага трактарнага завода, МАЗа, «Амкадора», Бабруйскагрmaша — чатырох буйных брэндаў, якія з'явіліся за апошнія пяць гадоў у гэтай арабскай краіне, — адзначыў сенатар. — Створаны яны агульнымі намаганнямі як нашых прамыслоўцаў, так і замежных устаноў Беларусі ў Каіры. Таму, канешне ж, вельмі важна дапамагчы кадрамі, каб падтрымаць гэтыя сумесныя праекты.

Вольга АНУФРЫЕВА.

«Задача — гарантаваць грамадскую бяспеку, і ўлада з ёй справіцца»

Сяргей РАЧКОЎ,
старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:

— Пытанні нацыянальнай бяспекі заўсёды важныя, не толькі падчас электаральнага перыяду. Вы бачыце, у якім неспакойным свеце мы цяпер жывём. Я ўжо адзначаў аднойчы: усе чакалі, што пасля пандэміі свет стане мякчэйшы, дабрэйшы, усе пачнуць супрацоўнічаць. На самай справе ўсё адбываецца нашмат больш жорстка. Кожны адстойвае свае нацыянальныя інтарэсы, кожны імкнецца атрымаць нават у гэтых умовах нейкія перавагі, у першую чаргу ў гандлёвай, эканамічнай галіне, але асобныя буйныя гульцы — нават у геапалітычнай прасторы. Таму, канешне ж, гарантаваць грамадскую бяспеку ў краіне — гэта краеугольная задача ўлады, і я ўпэўнены, што яна справіцца з ёй.

МЕРКАВАННІ

«Створаны ўсе ўмовы, каб «разбудзіць» у беларуса прадпрымальніцкую жылку»

Валянцін БАЙКО,
член Савета Рэспублікі, бізнесмен:

— Бачу, колькі ўсяго робіцца ў краіне, каб чалавек мог зарабляць для сябе і сваёй сям'і. Створаны ўсе ўмовы, каб беларусы мелі магчымасць займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю — ад дробнага і сярэдняга бізнесу да IT-сферы.

Зразумела, што само нам з неба нічога не ўпадзе. У кожнага жыхара нашай краіны павінна быць жаданне самааддана працаваць, каб дабівацца высокіх вынікаў. Толькі такі падыход вядзе да дабрабыту кожнага грамадзяніна.

Гэтым прынцыпам карыстаецца і наша кампанія. «Контэ Спа» пачала работу ў 1997 годзе з вытворчасці звычайных калготак, якія тады былі ў дэфіцыце. Сёння мы вядучыя вытворцы вырабаў лёгкай прамысловасці ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Летась значна пашырылі асартымент: асвоілі выпуск ніжняй бялізны, трыкатажу, шкарпэтак, легінсаў, джынсаў. Гэтаму папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа. Мы ўзмацнілі каманду, закупілі абсталяванне, удасканалілі тэхналогіі. І цяпер можам казаць пра станоўчыя зрухі.

Значная частка прадукцыі прадпрыемства, а гэта 70 %, ідзе на экспарт у 30 краін свету. Асноўныя рынкі — гэта Расія і Украіна. Але мы дыверсіфікуем рынак, як таго патрабуе час. На гэта нацэльвае і лідар дзяржавы. Таму сёння мы можам казаць пра новыя адрасы паставак. Асвойваем рынак Ізраіля і краін Паўднёвай Амерыкі. У Францыі знайшлі дыстрыб'ютара, які мае трывалыя сувязі, і спадзяёмся на пастаўкі ў еўрапейскія краіны.

Пры гэтым «Контэ Спа» не падзяляе прадукцыю на ўнутраны гандаль і экспарт. Усё вырабляецца на высокім якасным узроўні. Нашы спажыўцы гэта цэняць і аддаюць перавагу вядомаму і праверанаму вытворцу. Пра гэта сведчыць залаты медаль у спажывецкай намінацыі на конкурсе «Брэнд года»: тавар выбралі менавіта пакупнікі незалежным апытаннем. Вядома, у скарбонцы прадпрыемства даволі шмат розных узнагарод у конкурсах «Брэнд года», «Выбар года», «Народная марка» і іншых, у тым ліку міжнародных.

Прадпрыемства не толькі ўкладвае сродкі ў развіцце сваёй кампаніі, але і займаецца інвестыцыйнай дзейнасцю. Прыкладам можа служыць гандлёва-забаўляльны комплекс «Трыніці», частка якога ўжо даступна для наведвальнікаў. Будаўніцтва аб'екта працягваецца. Таксама кампанія выдаткавала сродкі на добраўпарадкаванне развязкі каля гандлёвага цэнтра. У горадзе, як і ў цэлым у краіне, для інвестара створаны спрыяльныя ўмовы, таму мы не застаёмся ў баку і ўкладваем значныя сродкі ў рэалізацыю інвестыцыйных праектаў.

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

І КАБ БЕЗ ДЭФІЦЫТУ...

На сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў абмяркоўвалі тэму гандлю. Для Віцебшчыны яна актуальная яшчэ і таму, што ў рэгіёне налічваецца каля 5,7 тысячы населеных пунктаў.

Зразумела, што гэтая галіна — адна з найважнейшых у эканоміцы. Акрамя забеспячэння таварамі і паслугамі грамадзян, гандаль — яшчэ і збыт айчыннай прадукцыі, «вектар канкурэнтаздольнасці», занятасць насельніцтва, падаткі.

Кіраўнік аблсавета Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ расказаў, што падчас камандзіровак цікавіцца ў мясцовых жыхароў іх задаволенасцю ўзроўнем гандлёвага і бытавога абслугоўвання. Ён даручыў старшыням гарадскіх, а асабліва раённых і сельскіх Саветаў спрыяць таму, каб не ўзнікала дэфіцыту.

Уладзімір Цярэнцьеў лічыць: важна, каб цэны на тавары не білі па кішэні спажыўцоў. Трэба кантраляваць, каб не рэалізоўваліся тавары, тэрмін ужывання якіх скончыўся. Здавалася б, як жа інакш? Але прыкладаў такіх не адзінкі. Пацвярджэнне — маніторынгі Камітэта дзяржкантролю і іншых правяраючых.

> Неабходна яшчэ раз упэўніцца ў тым, ці ўсё магчымае зроблена дзеля забеспячэння надзейнай работы так званых крам на колах. Нават калі ў вёсцы жыве ўсяго некалькі грамадзян, іх трэба забяспечваць па графіку ўсім неабходным.

Адсутнасць скаргаў у гэтым пытанні і наогул ва ўсім, што датычыцца гандлю, павінна быць пацвярджэннем правільнага падыходу. Пры гэтым не трэба забываць, што пры сацыяльнай нагрузцы неабходная фінансавая стабільнасць у дзейнасці гандлёвых прадпрыемстваў.

Дэпутат аблсавета, член Савета Рэспублікі, начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Віцебскага аблвыканкама Ірына ЛЯЎКОВІЧ канстатавала, што за апошнія дзесяць гадоў колькасць гандлёвых аб'ектаў павялічылася ў 1,5 раза, у развіццё галіны інвеставана каля 700 мільёнаў рублёў.

У цяперашні час абслугоўванне насельніцтва ажыццяўляюць больш за 13,5 тысячы гандлёвых аб'ектаў розных фарматаў, 76 гандлёвых цэнтраў, 55 рынкаў і 1735 пунктаў грамадскага харчавання.

Дынамічна развіваецца інтэрнэт-гандаль: зарэгістравана 848 віртуальных крам. Дарэчы, іх колькасць за апошнія пяць гадоў узрасла больш чым у два разы.

Пераўтварэнні ў гандлі дазволілі ўдвая павялічыць рознічны тавараабарот за апошнія дзесяць гадоў.

Каб гандаль, грамадскае харчаванне і бытавое абслугоўванне развіваліся ў глыбінцы, быў прыняты Указ Прэзідэнта № 345. Ім прадугледжаны беспрэцэдэнтныя падатковыя льготы і прэферэнцыі — напрыклад, у пытаннях набыцця маёмасці, выплаты падаткаў, адмены антыманапольнага абмежавання на пашырэнне гандлёвых плошчаў. Ёсць і іншыя «бонусы» на вёсцы. Адна з задач дэпутатаў — больш актыўна садзейнічаць прыцягненню суб'ектаў прадпрымальніцтва. Добра, што ўсё больш прыкладаў таго, як прадпрымальнікі, буйныя гандлёвыя сеткі карыстаюцца магчымасцю зарабіць у правінцыі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Паўнамоцтваў у мясцовых Саветаў дастаткова»

Вікторыя ЛАДУЦЬКА,
старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў:

Перакананая, што сёння менавіта на першасным тэрытарыяльным узроўні вызначаюцца і вырашаюцца найбольш вострыя праблемы. І паўнамоцтваў у дэпутацкага корпуса мясцовых Саветаў дастаткова. Яны, працуючы ў цесным кантакце з органамі выканаўчай улады, аказваюць уплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё сельсаветаў, сваіх раёнаў у цэлым, а галоўнае — вырашаюць канкрэтныя праблемы грамадзян.

Дэпутацкі корпус Гомельскага раёна — гэта 34 чалавекі, склад сельскіх Саветаў — 252 дэпутаты. Гэта людзі, якія знаходзяцца ў гушчы праблем і пытанняў мясцовых жыхароў.

Хачу звярнуць увагу на шэраг паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця нашага раёна. Па выніках мінулага і бягучага гадоў уведзена амаль 42 тысячы квадратных метраў жылля. За гэты перыяд новыя кватэры атрымалі 149 шматдзетных сем'яў.

Зараз у рабочым пасёлку Бальшавік вядзецца будаўніцтва першага ў краіне жылога дома з электракацельняй. Ён змяшчае 60 кватэр. У 2016—2019 гадах на тэрыторыі раёна ўведзена 1279 дамоў індывідуальнай жыллёвай забудовы.

Адна з галоўных задач развіцця населеных пунктаў — забяспечыць стапрацэнтную якасць пітной вады. Летась у Гомельскім раёне пабудаваны пяць станцый абезжалезвання. Аб'екты з'явіліся ў населеных пунктах Аздзеліна, Цярэнічы, Целяшы, Даўгалессе, Зябраўка. За пяць месяцаў бягучага года ўжо пабудаваны чатыры станцыі. Яны адкрыты ў Раманавічах, Клімаўцы, Маркавічах і Грабаўцы. Цяпер ідзе распрацоўка праектнай дакументацыі па падобных аб'ектах для населеных пунктаў Церуха, Макаўе, Міхалькі, Лапаціна і Царкоўе.

З пачатку гэтага года ў Гомельскім раёне пасля капрамонту ўведзена ў эксплуатацыю амаль шэсць тысяч квадратных метраў жылля. Цяпер работы вядуцца яшчэ ў шасці жылых дамах. Да канца года капітальна адрамантуюць амаль 13 тысяч «квадратаў» жылля.

Сёлета з раённага бюджэту на капітальны і бягучы рамонт установ адукацыі выдзелена больш за 477 тысяч рублёў. Выдаткаваны сродкі для набыцця абсталявання відэаназірання ва ўстановах адукацыі. 20 тысяч рублёў накіравана на набыццё інтэрактыўных сэнсарных сістэм для школ Гомельскага раёна.

«Самае каштоўнае на гэтым свеце — мір і спакой»

Рыгор БЫСЮК,
член Савета Рэспублікі, дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»:

— Хачу сёння пагаварыць аб тым, што зроблена ў апошнія гады і ў нашым мемарыяльным комплексе, і ў краіне ў цэлым. Толькі сляпы не заўважыць пазітыўных перамен у вялікіх гарадах, а таксама ў глыбінцы, у аграгарадках. Пра значныя эканамічныя праекты мы можам меркаваць нават не выходзячы за межы мемарыяльнага комплексу. Ніводная дэлегацыя не абмінае крэпасць. Пакланіцца вечнаму агню прыходзяць бізнесмены, інвестары, палітыкі. Яны наведваюць музеі, удзельнічаюць у экскурсіях, часта гаворка заходзіць пра рэалізацыю тых ці іншых праектаў, у якіх яны зацікаўлены.

А звычайныя экскурсанты-наведвальнікі, асабліва з замежжа, абавязкова звяртаюць увагу на нашы добрыя дарогі, дагледжаныя населеныя пункты, квітнеючыя палеткі. За апошняе дзесяцігоддзе перажыла маштабную мадэрнізацыю Брэсцкая крэпасць. Мы адкрылі шэраг новых музеяў. За гэта мы пастаянна чуем словы падзякі, асабліва ад сталых людзей. Яны ж заўсёды нагадваюць нам пра важнасць, каштоўнасць міру і спакою ў краіне. Мне яшчэ пашчасціла на гэтай рабоце застаць некаторых абаронцаў крэпасці, ветэранаў вайны. Яны не стамляліся напамінаць пра наш абавязак перад тымі, хто не дажыў да перамогі, — захаваць мір і парадак. Асабліва гэта згадваецца цяпер, калі ў інтэрнэце раздаюцца заклікі ўзяць удзел у розных несанкцыянаваных выступленнях. Гэта вельмі небяспечна, і абавязак старэйшага пакалення — давесці да свядомасці дзяцей, унукаў, што любыя спробы дэстабілізацыі недапушчальныя. Не варта верыць безадказным заклікам і прапановам. Трэба больш думаць сваёй галавой. А каб развіць уменне думаць, аналізаваць, супастаўляць, неабходна чытаць мастацкую літаратуру, асабліва класіку, глядзець добрае кіно, наведваць музеі, выстаўкі, развівацца і ўдасканальвацца інтэлектуальна і духоўна.

Гэтае сцвярджэнне, што самыя каштоўныя на свеце мір і спакой, не з паветра ўзялося, яно выпакутавана нашымі продкамі. Каб усвядоміць яго, трэба самому мець пэўны ўзровень ведаў. Таму прыходзьце ў крэпасць, наведвайце нашы музеі, думайце!

Жыві і квітней, Беларусь! Наша спадчына

КАБ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Ужо гэтай восенню, кажа **намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама Наталля СТАНКЕВІЧ,** плануецца адкрыццё адноўленай вежы Гальшанскага палаца для турыстаў – завяршаецца мантаж падсветкі вежы і сістэмы відэаназірання, выконваюцца іншыя неабходныя работы, распрацоўваецца праграма адкрыцця. У перспектыве не сапсаваць гістарычны ландшафт, а стаць часткай турыстычнага комплексу мусяць візіт-цэнтр з сувенірнай крамай, аўтастаянка і санітарныя памяшканні для наведвальнікаў – гэта наступны этап работы.

Помнік архітэктуры XIX стагоддзя, неагатычная капліца ў аграгарадку **Закозель, што на Драгічыншчыне,** – не самая «раскручаная» сёння славутасць, але, упэўненыя спецыялісты, беларускі Нотр-Дам можа стаць сапраўднай перлінай і культурным брэндам не толькі брэсцкага Палесся, але і краіны ў цэлым. Хоць, безумоўна, гэта задача вымагае нямала сіл, часу і фінансавай падтрымкі – 180-гадовая капліца-пахавальня роду Ажэшкаў, якая з'яўляецца часткай сядзібна-паркавага ансамбля, шмат гадоў знаходзіцца ў крытычным стане – не захаваліся ні маляўнічыя вітражы, ні статуі гаргулій, разбураецца і асыпаецца дах... Актыўныя аднаўленчыя работы тут пачаліся летась, калі за 50 тысяч рублёў, зароблены рэгіёнам падчас рэспубліканскага суботніка, а таксама за сродкі з абласнога бюджэту і прэзідэнцкага фонду па падтрымцы культуры і мастацтва ўдалося правесці першачарговыя супрацьаварыйныя мерапрыемствы – расчысціць звод, дэманціраваць крыжы, зняць каваныя і ляпныя элементы, каб спыніць далейшае разбурэнне ўнікальнага помніка архітэктуры. Сёлета, расказала «МС» **метадыст па гісторыка-культурнай спадчыне Драгічынскага райвыканкама Людміла ВЕРАМЕЙЧЫК,** работы працягваюцца за сродкі з прэзідэнцкага фонду (348,5 тысячы рублёў) і мясцовага бюджэту (200 тысяч рублёў) – у прыватнасці, рэстаўратары аднаўляюць звод і франтоны капліцы. Дарэчы, далучыцца да выратавання архітэктурнага помніка можа кожны нераўнадушны беларус – аддзел культуры Драгічынскага райвыканкама працягвае адпаведную краўдфандынгавую кампанію, пералічыць грошы на спонсарскі рахунак можна ў тым ліку праз АРІП.

Акрамя таго, за кошт сродкаў з фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы культуры і мастацтва ў сховішчы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі вернецца цэлы шэраг беларускіх рукапісных і друкаваных кніжных помнікаў. **Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь СУША** адзначыў: «Гаворка ідзе пра вельмі дарагія

і асабліва каштоўныя асобнікі. Гэта, напрыклад, адно з прыжыццёвых выданняў Мялеція Сматрыцкага. Наколькі нам вядома, яго аўтарскіх і прыжыццёвых выданняў у краіне не захавалася, хоць ён быў аўтарам шэрагу літаратурных і багаслоўскіх прац. Сярод рарытэтаў, якія набываюцца, надзвычай каштоўны рукапіс татараў Беларусі – хамаіл, напісаны на беларуска-польскай мове арабскімі літарамі. Таксама бібліятэка атрымае комплекс архіўных дакументаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Абсалютна ўнікальнымі з'яўляюцца прывілей і грамата каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх – Жыгімонта Вазы і Уладзіслава IV, якія кіравалі дзяржавай у канцы XVI – пачатку XVII стагоддзя (адзін з названых дакументаў – на паперы, другі – на пергаменце, адзін – на лацінскай мове, другі – на беларускай). З улікам таго, што дакументаў за подпісам караля і з яго пячаткай у нас захавалася вельмі мала, гэта матэрыялы сапраўды выключнага значэння». Зрэшты, не варта забывацца і на сацыяльную значнасць гэтай работы – унікальныя дакументы і кніжныя рарытэты будуць дэманстравацца ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі самай шырокай аўдыторыі і паспрыяюць шанаванню сваіх каранёў, развіццю патрыятызму.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

ГОМЕЛЬШЧЫНА

У ПАЛОНЕ АРХІТЭКТУРНАЙ ВЫТАНЧАНАСЦІ

СЯДЗІБНЫ комплекс XIX стагоддзя Козел-Паклеўскіх на Гомельшчыне сёлета адзначае першы юбілей як цалкам адноўлены гісторыка-культурны аб'ект. Пяць гадоў таму тут скончылася маштабная рэстаўрацыя. Адраджэнне палацава-паркавага ансамбля стала сапраўды знакавай падзеяй: ён заняў сваё пачэснае месца ў гістарычнай спадчыне Беларусі. Цяпер гэта важны пункт турыстычных вандровак па Гомельскай вобласці.

Паўночны захад Гомельшчыны, дваццаць кіламетраў ад Жлобіна, паварот да аграрнага каледжа ў Чырвоным Беразе. І вось яна – адроджаная прыгажосць XIX стагоддзя, палацава-паркавы комплекс, пабудаваны 127 гадоў таму.

Уласна былая панская сядзіба – частка музейнага комплексу пад агульнай назвай «Чырвоны Бераг». Тут аб'яднаны патрыятычны маршрут – мемарыяльны комплекс «Помнік дзецям–ахвярам Вялікай Айчыннай вайны»; архітэктурна-гістарычны кірунак – сядзіба XIX стагоддзя Козел-Паклеўскіх; краязнаўчы экскурс – парк як помнік прыроды і аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

– Гісторыя гэтага маёнтка пачынаецца яшчэ ў XVI стагоддзі, – запрашае пагрузіцца ў мінуўшчыну **старшы навуковы супрацоўнік музея-сядзібы Марыя ТКАЧОВА.** – Сама мясціна змяніла шмат уладальнікаў, але толькі пры апошніх гаспадарах Гатоўскіх і Козел-Паклеўскіх быў створаны палацава-паркавы ансамбль у яго сучасным выглядзе.

Вядома, што ў 1893 годзе гаспадар маёнтка генерал-лейтэнант у адстаўцы Міхаіл Гатоўскі падарыў яго сваёй дачцэ Марыі – жонцы заможнага дваранiна Вінцэнта Козел-Паклеўскага. Раскошны падарунак Гатоўскі прымеркаваў да нараджэння ўнучкі. Да гэтага яго намаганнямі сядзіба перажыла сапраўдную архітэктурную рэвалюцыю: панскі дом, дом аканома, гаспадарчыя пабудовы і нават плот паставілі з цэглы ўзамен драўляных. Міхаіл Гатоўскі рыхтаваў падарунак, варты сям'і дачкі і зяця-мільянера.

Новы замак – узор так званага архітэктурнага стылю гістарызму: спалучаюцца элементы готыкі, рэнесансу, ампіру, мадэрну і іншых кірункаў. Марыя Ткачова тлумачыць, чаму з першага позірку наведвальнік сядзібы трапляе ў палон архітэктурнай вытанчанасці:

– У Беларусі вы нідзе не ўбачыце такой разнастайнасці дойлідства, сканцэнтраванай у адным аб'екце.

Побач з палацам – невялікі англійскі парк, закладзены галоўным садоўнікам Варшавы Францішкам Шаніёрам. Тут да гэтых часоў шмат старых дрэў, узрост некаторых большы за 140 гадоў.

Пасля нацыяналізацыі былой панскай сядзібы ў будынку маёнтка ствараюць сельскагаспадарчую школу, потым – сельгастэхнікум. Сёння ў флігелі знаходзіцца адміністрацыя Чырвонабярэжскага дзяржаўнага аграрнага каледжа, а асноўны палац стаў музеем.

– Падчас апошняй вайны сядзібу ператварылі ў нямецкі вайсковы шпіталь, – працягвае спецыяліст. – Скарыстаўшыся тым, што тэрыторыя стала фактычна медбазай, каля будынка фашысты арганізавалі дзіцячы канцлагер: малых рыхтавалі ў донары ці гастарбайтары. У памяць пра тыя трагічныя падзеі створаны вядомы мемарыял у Чырвоным Беразе.

Між тым рэстаўрацыя сядзібнага комплексу пачалася ў 1996 годзе і праходзіла ў шэсць этапаў. Фінансаваліся работы з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў.

– Выдатная асаблівасць сядзібы – высокая ступень аўтэнтычнасці, – акцэнтуе ўвагу на экстэр'еры і інтэр'еры Марыя Ткачова. – Для помніка гісторыі ўсходняй часткі Беларусі прызнана ўнікальнай ступень захаванасці ўнутранага ўбранства дома. На момант пачатку рэстаўрацыі сядзібы захаванасць ляпніннага аздаблення залаў складала 86 %.

Старшы навуковы супрацоўнік расказвае, што захаваліся ўсе каваныя вырабы. У залах – «родныя» падаконнікі, плітка на падлозе, калоны, лесвіца. Асабліва ўражвае не кранутая часам ляпніна па столях.

> Зараз сядзіба рыхтуецца да новага гістарычнага фэсту «Дарогамі старога парку». Інтрыгу захоўваюць, але абяцаюць поўнае пагружэнне ў атмасферу старажытных часоў.

– Калі скончылася рэстаўрацыя, перад намі паўсталі вельмі прыгожыя, але голыя сцены. Захавальнікі і навуковыя спецыялісты – жанчыны. Нарадзіўся чыста жаночы ход – напоўніць прастору жыццём пры дапамозе хатніх раслін. Так першымі ў залах пасялілiся кветкі.

Потым прастора стала абрастаць экспанатамі і ўсімі неабходнымі элементамі інтэр'еру. Штосьці прынеслі мясцовыя жахары. Частку экспанатаў музейнаму комплексу перадалі мытныя службы – гэта канфіскаваныя рарытэты. Значную колькасць прадметаў інтэр'еру XVIII – XIX стагоддзяў перадаў у карыстанне гомельскі калекцыянер Сяргей Пуцілін. Цяпер, як кажуць, залы гавораць на мове мінулых стагоддзяў.

Асобнае месца ў сядзібе адводзіцца адноўленаму панскаму зімоваму саду. Падбор раслін – заслуга супрацоўнікаў цэнтральнага батанічнага саду Акадэміі навук Беларусі.

– Адноўлена радавое дрэва двух родаў былых гаспадароў сядзібы – Гатоўскіх і Козел-Паклеўскіх, – расказвае спецыяліст пра нашчадкаў Марыі Гатоўскай і Вінцэнта Козел-Паклеўскага. – Цяпер іх патомства жыве ў Данii і Вялікабрытаніі. Самі Марыя і Вінцэнт Козел-Паклеўскія знайшлі спачын у Варшаве. Да пэўнага часу ў нас была магчымасць падтрымліваць зносіны з іх родным унукам, дарэчы, поўным цёзкам свайго дзеда Вінцэнта Альфонсавіча. Ён вельмі нам дапамог, бо добра памятаў сваю бабулю Марыю і ўвогуле да гісторыі свайго роду адносіўся з вялікай пашанай.

Праўнук былых гаспадароў па лініі старэйшай дачкі Козел-Паклеўскіх – Ян Тчэшэцкі – таксама дапамагаў музею-сядзібе ў Чырвоным Беразе, кажа Марыя Дзмітрыеўна. Гэтыя нашчадкі старажытнага роду Козел-Паклеўскіх – аўтары кніг-успамінаў. На жаль, яны пайшлі з жыцця, і цяпер сувязь пакаленняў аслабляецца.

Сёння сядзібны комплекс Козел-Паклеўскіх – цэнтр адукацыйна-культурнага жыцця ў рэгіёне. Для жыхароў Жлобінскага раёна і гасцей Гомельшчыны рыхтуюць цікавыя і разнастайныя мерапрыемствы, адраджаюць дваранскія балі. Зараз сядзіба рыхтуецца да новага гістарычнага фэсту «Дарогамі старога парку». Інтрыгу захоўваюць, але абяцаюць поўнае пагружэнне ў атмасферу старажытных часоў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

АДКРЫВАЕМ НОВЫЯ МАРШРУТЫ

На пачатку жніўня ў эфіры «Беларусь 2» распачаўся новы сезон праекта «Камень, нажніцы, папера». Творчая група праграмы цяпер збіраецца ў новыя вандроўкі і запрашае тэлегледачоў разам падарожнічаць па краіне.

— Мы запусцілі чацвёрты сезон праекта (і ўжо тры сезоны ён выходзіць менавіта ў фармаце трэвэл-шоу). Сёлета са здымачнай групай аб'ездзілі каля 150 населеных пунктаў і ў новым сезоне пазнаёмім нашых гледачоў з мясцінамі, якія маюць незвычайныя назвы. Разам з намі кожны ахвотны можа, нават нягледзячы на закрытыя граніцы, пабываць у самых розных краінах, — кажа **вядучая і кіраўнік «Камень, нажніцы, папера» Вікторыя КАСЯНЮК.** — Напрыклад, у найбліжэйшых выпусках мы з вамі даведаемся, які напой у Дубліне самы папулярны і па якіх правілах трэба гуляць у мафію з мясцовай моладдзю. А ў Парыжы наша карэспандэнтка знайшла Эйфелеву вежу і змагла там выпіць кавы. Таксама пазнаёмім вас з сапраўднай француженкай, якая жыве ў нас... У кожным населеным пункце мы заўсёды шукаем самыя цікавыя падрабязнасці пра яго, каб дзяліцца імі з нашай аўдыторыяй.

У новым сезоне журналісты, якія ствараюць «Камень, нажніцы, папера», пабываюць у Парыжы, Місуры і Амерыцы, а таксама ў Манголіі, Літве, на Байкале, Сахаліне і Балі, не выязджаючы за межы Беларусі. Разам з імі і тэлеаўдыторыя зможа даведацца пра гісторыю беларускіх вёсак з гучнымі назвамі, а яшчэ пазнаёміцца з мясцовымі жыхарамі і пашукаць рысы падабенства айчынных паселішчаў з іх славутымі цёзкамі, вядомымі на ўвесь свет.

Каманда праекта разам з тым не абміне ўвагай і іншыя месцы на карце з цікавымі назвамі. Напрыклад, пашукае рай у Раі і Шалашах, даведаецца, якога росту людзі ў вёсках Нізкія і Рослыя, адпачне ў Забаве і Радасці і нават паразумеецца з жыхарамі вёсак Уць, Эрд, Уна і Эні. Нагадаем, што па правілах праграмы ў спецыяльных канвертах з лагатыпам разам з маршрутам журналістаў кожны раз чакаюць заданні, звязаныя з пэўным месцам. Так, у найбліжэйшым выпуску ім трэба будзе высветліць, што ёсць італьянскага ў беларускім Турыне альбо ірландскага — у нашым Дубліне. Даведаемся пра гэта і зробім шмат іншых цікавых адкрыццяў у кампаніі з «Камень, нажніцы, папера». Чарговы выпуск — у нядзелю на «Беларусь 2».

Алена ДРАПКО.
Фота Белтэлерадыёкампаніі.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 100

У гонар сотага выпуску шахматнага клуба нашай газеты, адноўленага ў 2016 годзе, аўтар гэтых радкоў прапануе сваю выяўленчую задачу, дзе расстаноўка фігур сімвалізуе лічбы 100 **(гл. дыяграму).**

Белыя: Крa5, Фh4, Сc4, Кd3, пп. a4, d5, e4, f4, g3, g5 (10).
Чорныя: Крa3, Лc3, пf3 (3).
Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У складзе зборнай Беларусі на сусветнай анлайн-алімпіядзе ФІДЭ, якая праходзіць з 22 ліпеня да 30 жніўня, выступаюць: на мужчынскіх дошках — Уладзіслаў Кавалёў і Аляксей Аляксандраў (запасныя — Кірыл Ступак і Вячаслаў Зарубіцкі), на жаночых — Вольга Бадэлька і Настасся Зязюлькіна (запасныя — Ланіта Суяцко і Яна Ільючык), на юніёрскіх — Міхаіл Нікіценка і Аляксандра Тарасенка (запасныя — Дзяніс Лазавік і Ксенія Зелянцова). 163 зборныя налічваюць разам каля 1500 гульцоў і разбіты на некалькі дывізіёнаў.

Дзяніс Лазавік перамог у буйным (670 удзельнікаў) міжнародным анлайн-турніры сярод шахматыстаў да 14 гадоў.

* * *

Школа шахмат ФІДЭ ў Мінску і Беларуская федэрацыя шахмат падтрымалі ініцыятыву навучыць старажытнай гульні ў гонар Міжнароднага дня шахмат ва ўсім свеце яшчэ мільён чалавек і запрасілі да сябе юных футбалістаў і хакеістаў з дынамаўскіх клубаў Брэста і Мінска. З азамі шахмат іх пазнаёміла міжнародны майстар Наталля Папова, пяціразовая чэмпіёнка Беларусі.

У гонар свята ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках міжнародны гросмайстар Юрый Ціханаў і міжнародны майстар Міхаіл Нікіценка правялі сеансы адначасовай гульні, таксама адбыліся тэматычная экскурсія і прэс-канферэнцыя.

* * *

Прывядзём яшчэ дзве партыі з чарговага анлайн-турніра вядучых гросмайстраў свету.

Косаўская рэзідэнцыя, пабудаваная ў стылі англійскай неаготыкі, нагадвала рамантычны таямнічы замак. І рамантызм, і велічнасць, і таямнічасць стваралі найперш вежы, крыху падобныя на старажытныя замкавыя. Кожная з дванаццаці вежаў сімвалізавала месяц года. Яны сталі галоўным архітэктурным элементам палаца, яго «каньком». Вежы маюць зубчастае завяршэнне, што ўзмацняе адчуванне старадаўнасці і нейкай непрыступнасці. Гэтаму паспрыялі таксама аконныя і дзвярныя праёмы стральчатых абрысаў, падобныя да байніц. Аграмадныя гатычныя праёмы ў сценах галерэй наводзяць на думку пра асаблівую загадкавасць і веліч пабудовы.

Засталося нямала дакументальных сведчанняў, якія шыкоўныя і незвычайныя балі і прыёмы праходзілі ў Косаве. Упрыгажэннем адной залы служыў вялікі акварыум з рыбкамі, а ў зімовым садзе на прывязі сядзеў сапраўдны леў. Славутая бібліятэка Пуслоўскіх саступала хіба толькі суседняй сапегаўскай у Ружанах. Некалькі тысяч тамоў і рукапісаў налічвала кнігасховішча палаца. Кожная зала мела свой асаблівы інтэр'ер, свой колер, за які і атрымала назву. Былі тут Белая, Чорная, Ружовая, Сярэбраная залы.



Інтэр'ер адной з залаў.

Вынікі рабавання і пажару

Пасля таго як на пачатку нулявых адрадзілі сядзібу Тадэвуша Касцюшкі і сюды сталі прыязджаць шматлікія госці, усе раптам заўважылі сцены палаца наводдаль за дрэвамі. З-за высачэзных дрэў з пагорка тыя сцены выглядалі і велічна, і рамантычна-загадкава, і гэтай далёкай прыгажосцю міжволі засланялі ўсё навокал. Палац нібы прасіў, заклінаў быць адноўленым...

За сваю гісторыю ён перажыў нямала. У канцы XIX стагоддзя імкліва пераходзіў ад аднаго гаспадара да другога, пакуль не быў адпісаны ў дзяржаўную казну. У час Першай сусветнай вайны палац разрабавалі, каштоўнасці вывезлі за мяжу. За Польшчай тут была сельскагаспадарчая школа, дзе навучалі пчалярству. З пачаткам Вялікай Айчыннай у палацы размясцілася нямецкая камендатура, што і адыграла ракавую ролю: падчас аперацыі «Баграціён» партызаны спалілі палац. Пажар бушаваў больш за тыдзень, яго ніхто не тушыў. У 2008 годзе, калі аднаўленчыя работы толькі пачыналіся, будаўнікі так і называлі аб'ект — «руіны Косаўскага палаца». Ад былой велічы замка, дзе ў свой час налічвалася 88 пакояў, засталіся горы цэглы ды знявечаны фасад. І — успаміны пра Ружовую залу, у якой музіцыравалі, Чорную, дзе ігралі ў карты, Бальную, дзе адбываліся прыёмы і танцавалі...

Культурны комплекс

У 2006 годзе было прынята рашэнне аблвыканкама аб рэстаўрацыі. Праз два гады на пляцоўку прыйшлі будаўнікі. І вось на працягу 12 гадоў палац у стылі англійскай неаготыкі паступова набывае свой ранейшы выгляд. Летась там адкрылі гасцініцу і кавярню, якія карысталіся попытам аж да пачатку пандэміі. Цяпер вядзецца адбудоўванне на цэнтральным блоку. Тут задуманы шматфункцыянальны культурны комплекс з выставачнымі заламі, невялікай музейнай экспазіцыяй, прасторай для канферэнцый і Бальнай залай.

У Белай зале, яна ж Бальная, па рэдкіх фотаздымках, што захаваліся, адновяць сем фрэсак. Уся ўвага цяпер — унутраным інтэр'ерам. Мастакі пакрываюць пазалотай з тонкай фольгі сцены і столі. Аздабленне патрабуе ад майстроў асаблівай тонкасці і ўмення — неабходна захаваць стыль эпохі. Праект створаны ААТ «Брэстрэстаўрацыя». Гэтая ж арганізацыя вядзе работы па праекце афармлення парку. Умова — максімальна адпавядаюць гістарычнаму прататыпу. Пуслоўскія мелі больш чым сотню відаў раслін, прывезеных з усяго свету, у тым ліку экзатычных. Парк хутка ўпрыгожаць лістоўніцы, іншыя хваёвыя дрэвы, якія ў свой час раслі ў ваколіцах.

> Агульны кошт рэстаўрацыі набліжаецца да 27 мільёнаў рублёў. Сёлета плануецца асвоіць 6,7 мільёна з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў.

Агульны кошт рэстаўрацыі набліжаецца да 27 мільёнаў рублёў. Сёлета плануецца асвоіць 6,7 мільёна з абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў. **Галоўны спецыяліст упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Арцём БРУХАН** паведаміў, што першую чаргу палаца плануецца здаць у канцы гэтага года. Для турыстаў помнік адкрыты з кастрычніка 2017 года, калі стала дзейнічаць музейная экспазіцыя з пяці залаў. Ну а летась, як ужо гаварылася, прынялі наведвальнікаў кавярня і гасцініца.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

НЕ ТОЛЬКІ «БАЗАР»...

Папярэднія вынікі дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2016—2020 гады абмяркоўвалі ў Віцебску.

У прыватнасці, летась на фінансаванне адпаведных мерапрыемстваў выдаткавалі каля 59,9 мільёна бюджэтных сродкаў, а за чатыры гады толькі з бюджэту — 203,2 мільёна. Акрамя таго, культуру традыцыйна «падсілкоўваюць» пазабюджэтныя крыніцы фінансавання і практычна штогод павялічваецца доля платных паслуг.

Што ж цікавага зроблена на поўначы краіны?

У віцебскім помніку архітэктуры пазамінулага стагоддзя адкрылі адзіны ў краіне музей прыватнага калекцыянавання — знаходзіцца ён каля Летняга амфітэатра, а ў будынку, дзе працавалі Шагал, Малевіч і іншыя славутыя мастакі, з'явіўся музей, дзе можна адкрыць для сабе шмат цікавага з гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча.

У Талачыне завяршылі рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы ў Свята-Пакроўскім саборы, пабудаваным у пачатку XVII стагоддзя. Ну а ў «калысцы» беларускіх гарадоў, Полацку, правялі рамонт у Сафійскім саборы і музеі беларускага кнігадрукавання.

Ва Ушацкім раёне пасля рэканструкцыі адкрылі мемарыяльны комплекс «Прарыў». Адрамантавалі раённыя дамы культуры і дзіцячыя школы мастацтваў у Сянне, Дуброўне, Верхнядзвінску, Браславе, бібліятэкі — у Сянне і Верхнядзвінску, а ў Дуброўне — дом рамёстваў. У Аршанскім раёне, дзе, як вядома, адбываецца агульная «перазагрузка», таксама зроблена шмат для таго, каб установы культуры адчувалі сябе лепш.

Як заўсёды, вялікая ўвага ўдзяляецца выхаванню талентаў, будучых выкладчыкаў, кіраўнікоў гурткоў. І адораных дзяцей на Віцебшчыне нямала. Напрыклад, лаўрэатамі прэміі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў па падтрымцы таленавітай моладзі за чатыры гады сталі 24 навучэнцы каледжаў і 40 — дзіцячых школ мастацтваў. Стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі сталі 39 навучэнцаў. А прозвішчы 83 унесены ў банк даных гэтага фонду.

У пасяджэнні ўдзельнічаў і міністр культуры Беларусі Юрый Бондар. Ён даў высокую ацэнку калегам з Прыдзвіння, адзначыўшы добры вопыт Віцебска ў правядзенні маштабных культурных акцый, самая вядомая з якіх — міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Дарэчы, у наступным годзе ён пройдзе ўжо трыццаты раз. Падрыхтоўка пачалася.

А ўвогуле, штогод у вобласці праводзіцца больш за 100 тысяч масавых мерапрыемстваў. У тым ліку — дзесяць міжнародных, тры рэспубліканскія, больш за сорак абласных фестываляў і свят.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

П'ЕДЭСТАЛ ДЛЯ ГЕНЕРАЛА

У Шчучыне працягнуты прыём эскізных праектаў помніка Шарлю дэ Голю

Пакуль пададзена каля 20 заяў на ўдзел у конкурсе. Меркавалася, што прыём завершыцца 8 жніўня, але прымаць заяўкі вырашылі да 1 верасня. На думку арганізатараў, гэта дасць магчымасць прыцягнуць яшчэ больш творцаў.

Ідэя ўвекавечыць імя славутага французскага генерала і прэзідэнта Францыі ўзнікла невыпадкова. Як аказалася, у лёсе Шарля дэ Голя ёсць і беларускі след. Знойдзены дакументы, якія сведчаць пра тое, што будучы французскі прэзідэнт падчас Першай сусветнай вайны з ліпеня да верасня 1916 года знаходзіўся ў нямецкім лагеры для ваеннапалонных у Шчучыне.

Гэты факт стаў вядомы з ліста аднаго з французскіх афіцэраў, які таксама знаходзіўся сярод палонных. У адным са сваіх пісьмаў на радзіму ён указвае, што іх, 37 французскіх афіцэраў, прывезлі ў Шчучын паміж Гроднам і Лідай і ўтрымліваюць на другім паверсе двухпавярховага цаглянага дома.

Праўда, нейкі час лічылася, што гаворка ідзе пра польскі Шчучын, але больш падрабязнае вывучэнне абставін прывяло даследчыкаў у Беларусь. Было, напрыклад, вядома, што ў будынку, дзе трымалі палонных, знаходзілася вытворчасць драўніны, а ў гады Першай сусветнай тут якраз працавала піларама князёў Друцкіх-Любецкіх. Указвалася таксама на тое, што ў будынку 13 вокнаў. Гэта таксама няцяжка было праверыць, бо будынак захаваўся, зараз у ім знаходзіцца адзін з цэхаў завода «Аўтапровад». Вокнаў там сапраўды 13.

Французская дыпламатычная дэлегацыя не раз наведвала Шчучын з мэтай увекавечыць памяць свайго славутага суайчынніка. Мясцовыя ўлады ідэю падтрымалі. Рашэннем Шчучынскага райвыканкама быў аб'яўлены адкрыты конкурс эскізных праектаў будучага помніка. Нядаўна тэрмін падачы заявак падоўжылі да 1 верасня. Як паведаміла **намеснік старшыні Шчучынскага райвыканкама Алена ПАСЮТА**, ужо заявілася 18 канкурсантаў — як творчых калектываў, так і асобных аўтараў. Магчыма, пераможца праекта вызначыцца 11 верасня.

Што датычыцца самога помніка, дык тут няма нейкіх абмежаванняў. Па словах Алены Пасюты, гэта можа быць любая кампазіцыя, нават у поўны рост (спярша меркавалася, што будзе проста бюст). Галоўнае патрабаванне — адлюстраваць тую эпоху, калі будучы генерал быў яшчэ малады, дапасаваць яго вобраз да таго месца, дзе будзе ўстаноўлены манумент ці нават архітэктурны ансамбль. Не вызначаны і тэрміны ўстаноўкі помніка. Вядома, што сёлета 130-я гадавіна з дня нараджэння французскага палітычнага дзеяча.

Мясцовыя ўлады спадзяюцца, што шчучынскі след генерала стане яшчэ адной цікавай адметнасцю бязвізавай зоны. Праект таксама можа стаць пачаткам маштабнай работы па наладжванні як культурных, так і эканамічных сувязяў.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ГРОДЗЕНШЧЫНА

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПА-КАРАЛЕЎСКУ

Якой стане інтэр'ерная і музейная экспазіцыя адзінага ў Беларусі каралеўскага замка ў Гродне, дзе зараз ідзе маштабная рэканструкцыя

Агляд будзе даступны для наведвальнікаў у канцы года. На цяперашні час адноўлена траціна гістарычнага аб'екта. Узведзены вежы, а паміж імі — крапасная сцяна з галерэяй. Адбудавана некалькі аб'ектаў, якія былі тут у старажытнасці, у тым ліку камяніца і мерная хата. Зараз рыхтуецца музейная экспазіцыя па гісторыі замка, а таксама ствараюцца інтэр'еры, якія адпавядаюць замку Стэфана Баторыя.

Акцэнт на турызм

Неабходнасць рэканструкцыі замка прадыктавана некалькімі прычынамі. Як растлумачыла начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч, занепакоенасць выклікаў стан замка. Дайшло да таго, што ў памяшканнях фондаў і кабінетах навуковых супрацоўнікаў з'явіліся шчыліны. І хоць на першым паверсе сцены сапраўды тоўстыя і магутныя, але асядала падлога ў аддзеле прыроды. Такі аварыйны стан не спрыяў і развіццю экспазіцыі музея, якая, дарэчы, не аднаўлялася гадоў трыццаць, бо чакалі пачатку рэканструкцыі. **Каб вывесці замак з застою і захаваць яго для нашчадкаў, патрэбны былі дзейсныя меры.**

— І калі мы кажам, што адной з прычын была неабходнасць захаваць аб'ект з улікам яго фактычнага стану, то другой прычынай, і гэта таксама важна, з'яўляецца развіццё турызму і пазіцыянаванне горада як каралеўскага. А замкі ў Гродне якраз і з'яўляюцца такімі аб'ектамі. Стары замак заўсёды лічыўся самым папулярным аб'ектам як сярод беларускіх, так і сярод замежных турыстаў, — падкрэсліла Алена Клімовіч.

Сапраўды, гэта адзіная каралеўская рэзідэнцыя ў Беларусі, якая дайшла да нашых дзён. А паколькі аб'ект звязаны з гісторыяй Літвы і Польшчы, цікавасць да яго з боку замежных суседзяў вялікая. Як вядома, у Старым замку праходзілі першыя соймы Рэчы Паспалітай. Пазней для гэтых мэт былі пабудаваны Новы замак і мост, які злучае яго са старым. Гэты мост, дарэчы, — самы старажытны на тэрыторыі Беларусі. Вядома, такое знакавае месца, дзе вяршыўся лёс усёй Еўропы, не можа не цікавіць. Таму стаяла задача захаваць аб'ект і выкарыстаць яго турыстычны патэнцыял.

...І аднавіўся Стары замак

Рэканструкцыя Старога замка ў Гродне пачалася ў 2017 годзе. Пасля таго як спецыялісты ацанілі стан аб'екта, справа, нарэшце, зрушылася з мёртвага пункта. Праект пачаў набываць канчатковы выгляд, а сам замак — мяняцца.

Сёння завяршаецца першая чарга будаўніцтва. Гэта прыблізна траціна ўсіх работ — ад брамы да новай вежы. Узведзены асноўныя будынкі — дзве вежы з галерэяй паміж імі, адноўлена мураваная сцяна, ад якой тут захаваліся руіны. Пабудаваны некалькі аб'ектаў, што існавалі ў XVI стагоддзі. На вежах устаноўлены купал і флюгеры. І хоць зроблена толькі частка работы, аб'ект неверагодна змяніўся. Ці, правільней сказаць, значна наблізіўся да выгляду каралеўскага замка эпохі Стэфана Баторыя. У 1580-х гадах гаспадар стварыў тут сваю рэзідэнцыю, ператварыўшы былыя руіны ў прыгожы палац. Праўда, да нашых часоў замак дайшоў у выглядзе шэрых будынкаў, але цяпер зноў набывае былую веліч.

Па словах Алены Клімовіч, гатоўнасць першай чаргі складае 90 %. З пачатку рэканструкцыі асвоена 16 мільёнаў рублёў, выдаткаваных дзяржавай. Частка сродкаў накіравана на неабходную інжынерную інфраструктуру — падстанцыю і цепласеткі. Вядуцца работы па вырабе і мантажы дэкаратыўных элементаў, добраўпарадкуецца ўнутраны дворык. Першую чаргу плануецца здаць да канца года.

Суразмоўніца падкрэсліла, што рэканструкцыя вядзецца пад наглядам саміх праектантаў і навуковых супрацоўнікаў. Многія работы выконвае «Белрэстаўрацыя» — адзінае ў краіне спецыялізаванае прадпрыемства па рэстаўрацыйна-аднаўленчых работах. У прыватнасці, рэстаўратары выканалі ўсе работы па вырабе вокнаў і дзвярэй. Яны ж будуць узнаўляць каміны і печы, якія былі ў замку, а таксама — вітражы. У работах актыўна ўдзельнічае і грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз мастакоў». У стылі сграфіта на вежы Старога замка з'явіліся профільныя партрэты ў медальёнах, грыфоны і раслінны арнамент. Па перыметры размешчана 12 партрэтаў рымскіх імператараў і караля Стэфана Баторыя.

Таямніцы Замкавай гары

Тэрыторыя замка займае ўсю плошчу высокага ўзгорка. Адсюль пачаўся горад у XI стагоддзі, калі была ўзведзена першая абарончая драўляная крэпасць. Праз два стагоддзі вялікі князь Вітаўт пабудаваў тут каменны гатычны замак з пяццю вежамі і зрабіў яго сваёй рэзідэнцыяй. Дарэчы, гэтая пабудова відаць на вядомай гравюры Цюнта XVI стагоддзя.

Пазней, падчас праўлення Стэфана Баторыя, замак набыў велічныя рэнесансныя рысы. Усе эпохі так ці інакш дайшлі да нашых часоў. Штосьці таілася пад сучаснай тынкоўкай, штосьці захоўвалася ў нетрах гары і было выцягнута падчас раскопак.

Менавіта пры археалагічных работах яшчэ ў 30-я гады мінулага стагоддзя былі знойдзены рэшткі Ніжняй царквы і княжацкага церама XII стагоддзя. А сёлета ўдалося раскапаць муры замка Вітаўта, якія датуюцца XIV стагоддзем. З гэтага перыяду сярэднявечча дайшлі рэшткі Верхняй царквы. Затым — XVI стагоддзе. Знойдзена частка тынкоўкі тагачаснага замка Стэфана Баторыя. Вось колькі час археалагічных раскопак. Гэта ўнікальныя прадметы, якія адносяцца да часоў узнікнення горада і могуць быць уласнасцю княжацкай дынастыі. Тут і рэшткі адзення, абутку, і шахматныя фігуры і часткі шахматнай дошкі, аднесеныя навукоўцамі да XII стагоддзя. Нямала прадметаў побыту тых часоў — жаночыя ўпрыгажэнні, рэшткі посуду з бяросты. Для дэманстрацыі адзення тых даўніх часоў будуць зроблены манекены. Нешта ёсць у фондах музея, астатняе будзе вырабляцца. Ва ўсякім выпадку, спецыялісты гэты аспект прадумалі і стварылі лічбавую версію размяшчэння экспанатаў.

— Калі ўсё будзе ісці па плане і не ўзнікне нейкіх аб'ектыўных перашкод, экспазіцыя адкрыецца ў канцы года, — растлумачыла суразмоўніца. — Гэта дазволіць аб'екту жыць і прымаць наведвальнікаў. Бо інтарэс да замка вялікі не толькі ў беларусаў, але і ў замежнікаў, якія пакрысе пачынаюць вяртацца ў Гродна.

Ужо вызначаны чатыры памяшканні, якія атрымаюць інтэр'еры ў стылі XVI стагоддзя. Гэта капліца, каралеўская лазня, алебастравая зала і пакой чыноўніка. Работы па інтэр'ерах, магчыма, зоймуць 2-3 гады.

І хоць аблічча замка значна змянілася, галоўныя работы яшчэ наперадзе, у тым ліку і рэканструкцыя непасрэдна самога будынка. На сённяшні дзень зроблены перадпраектныя работы, а таксама зандажны аналіз кладкі, які сведчыць пра неаднаразовую перабудову замка. Работы вядзе інстытут «Гроднаграмадзянпраект». Канчатковы праект будзе зроблены пасля археалагічных даследаванняў. Раскопкі дазволяць вырашыць многія спрэчныя пытанні, у тым ліку і наконт знаходжання цэнтральнага ўвахода.

Дарэчы, плануецца даследаваць не толькі тэрыторыю замка, але і мясціны па-за ім. Магчыма, і тут удасца раскапаць што-небудзь унікальнае, як гэта было падчас папярэдніх работ. Бо хто ведае, што яшчэ тоіць у сабе гэтае старажытнае паселішча...

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

МІНШЧЫНА

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ ПАЛАЦА РАДЗІВІЛАЎ

стала магчымым у суверэннай Беларусі

Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс — сапраўдная архітэктурная жамчужына Беларусі. А пачыналася ўсё ў 1583 годзе, калі Мікалай Хрыстафор Радзівіл Сіротка залажыў мураваны замак на месцы драўлянага, 1533 года пабудовы. Да 1599-га ў яго будаўніцтве ўдзельнічаў італьянскі архітэктар Джавані Марыя Бернардоні. З XVI да XX стагоддзя ўключна гэта была рэзідэнцыя князёў Радзівілаў. Комплекс уключае ў сябе ўласна палац, замкавыя ўмацаванні і вялікі парк.

На працягу некалькіх стагоддзяў ён меў важнае ваеннае значэнне. Тут базіравалася прыватная армія Радзівілаў, захоўвалася артылерыя, ручная агнястрэльная зброя ды іншая вайсковая амуніцыя. Пасля некалькіх перабудоў феадальны замак ператварыўся ў палацава-замкавы комплекс. Ён прывабліве сваёй велічнасцю і рамантычнасцю, якую яму надаюць стройныя вежы і невялікія вежкі, вада ў сажалках і яркая зеляніна. Комплекс з'яўляецца адным з найлепшых у Еўропе. У 2005 годзе ён быў занесены ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

На працягу стагоддзяў замак зведаў шмат разбурэнняў і разрабаванняў падчас шматлікіх войнаў, якія праходзілі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, але зноў паўставаў з руін. У савецкі час тут месціўся санаторый, дзе адпачывалі і папраўлялі здароўе працоўныя. У 2001-м здраўніца была закрыта і перададзена пад апеку Міністэрства культуры для правядзення рэстаўрацыі. Большасць пакояў палаца, падмуркі, гадзіннікавая вежа, скляпы, падзямеллі былі ў занядбаным, аварыйным стане. Напачатку рэстаўрацыйныя работы рухаліся вельмі марудна, у асноўным мелі супрацьаварыйны характар. А ў ноч на 25 снежня 2002 года тут адбыўся пажар, які тушылі 92 ратавальнікі і 19 машын. Плошча пажару была не надта вялікая, але яго тушэнне ўскладняла нестандартная планіроўка збудавання. Гэты пажар падштурхнуў да маштабнай рэстаўрацыі палаца. Яе працэс не крытыкаваў толькі гультай. Неадназначную рэакцыю аднаўленчыя работы выклікалі і ў часткі спецыялістаў, якія лічылі, што пад выглядам рэстаўрацыі можа адбыцца замена аўтэнтычных фрагментаў помніка новымі, сучаснымі. Гучалі нават выказванні, што дапускаюцца шматлікія парушэнні агульнапрынятых міжнародных методык.

Тым не менш работы працягваліся. Першую чаргу замка ўвялі ў дзеянне ў 2008 годзе. Гэта блок з трох двухпавярховых будынкаў, уязная брама з вежай, прылеглая частка ўнутранага двара і інжынерная інфраструктура. Другі пускавы комплекс уключыў у сябе блок з пяці трохпавярховых будынкаў і адзін асобны. Асноўную частку там займаюць інтэр'ерныя і экспазіцыйныя залы. Што датычыцца інфраструктуры для абслугоўвання турыстаў і гасцей палацавага комплексу, то яна складаецца з рэстарана, дзе раней знаходзілася кухня Радзівілаў, гасцінічных VIP-апартаментаў, гасцініцы эканом-класа. Адноўлены ўязны мост ва ўнутраны двор, элементы замкавых умацаванняў, лядоўня. Пасля рэстаўрацыі таксама былі адкрыты бальная, камінная, малая сталовая, гетманская і тэатральная залы.

> Комплекс з'яўляецца адным з найлепшых у Еўропе. У 2005 годзе ён быў занесены ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Дваццатага ліпеня 2012 года палацавы комплекс цалкам адкрыўся для турыстаў, экскурсантаў і гасцей. Ужо да канца гэтага года яго наведала 431 тысяча чалавек, а комплекс зарабіў на музейна-экскурсійнай дзейнасці свой першы мільён долараў. І сёння ён не саступае пальму першынства іншым музеям Беларусі. Дакрануцца да гісторыі славутага магнацкага роду едуць беларусы, расіяне, палякі, літоўцы

і нават кітайцы. А дапамагаюць ім у гэтым не толькі экскурсаводы, але і аўдыягіды, запісаныя на розных мовах.

Акрамя экскурсій, у палацы ладзіцца шмат мерапрыемстваў для людзей розных узростаў і густаў: шматлікія квэсты, спецыяльныя выстаўкі, экспазіцыі. Штогод іх пералік пашыраецца і становіцца больш разнастайны.

Напрыклад, удзельнікі квэсту «Тайны і загадкі палаца Радзівілаў» змогуць атрымаць моцныя ўражанні ад наведвання закрытых для турыстаў месцаў комплексу: спусціцца ў падзямелле, зазірнуць у адкрытыя дзверы і знайсці даўнішнія адгадкі роду магнатаў.

Для маладажонаў прапануюць пастановачную цырымонію рэгістрацыі шлюбу ў тэатральнай зале. Прафесійныя акцёры і музыканты праводзяць урачысты абрад заключэння шлюбу пад гукі чароўнай музыкі. Гэта можа быць, напрыклад, класічны вальс у запісе або пад акампанемент жывых інструментаў. А першы танец жаніха і нявесты — паланэз з князем і княгіняй.

Дадам, што Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс стаў сапраўдным цэнтрам культуры. Тут праводзяцца канцэрты старажытнай і сучаснай класічнай музыкі, музычныя фэсты і фестывалі. Напрыклад, у жніўні госці змогуць атрымаць асалоду ад мелодый флейты, валынкі, фісгармоніі, піяніна. Штогадовым стаў «Баль у Радзівілаў». Традыцыяй магнатаў было запрашаць на яго замежных артыстаў, танцораў, спевакоў, музыкантаў, якія пад'язджалі да варотаў у карэтах. Часы мяняюцца, і цяперашнія госці з'яўляюцца на касцюмаваны баль на шыкоўных машынах. Значная частка яго застаецца відовішчнай тэатралізаванай дзеяй.

Не лішнім будзе купіць на памяць сувенір, паласавацца фірменнымі цукеркамі і шакаладам, якія можна набыць у кавярні і крамах музея, у дзіцячай кавярні «Салодкая батлейка».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и права заключения договоров аренды земельных участков в г. Высокое Брестской области

№ лота	Наименование объекта/адрес участка	Кадастровый номер	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т. ч. ограничения и условия в его использовании	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке
1	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **г. Высокое, ул. Дружная, 26** (наружная площадь – 144 кв. м, готовность основного строения – 7 %) и право заключения договора аренды земельного участка	124050500001001479	0,1431	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**4 512,71**	900,00	**538,89**	ограничений в использовании земель нет	газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение
2	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **г. Высокое, ул. Парковая, 1** (наружная площадь – 179 кв. м, готовность основного строения – 10 %) и право заключения договора аренды земельного участка	124050500001001773	0,1491	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**7 251,28**	1 400,00	**553,44**	ограничений в использовании земель нет	газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение
3	Не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **г. Высокое, ул. Спортивная, 5** (наружная площадь – 155 кв. м, готовность основного строения – 10 %) и право заключения договора аренды земельного участка	124050500001001772	0,1265	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	**6 684,26**	1 300,00	**553,44**	0,0438 – на мелиорируемых (мелиорированных) землях	газоснабжение, водоснабжение, электроснабжение
Размер штрафа уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232									**2 700,00 рублей**

Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65	**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в филиале № 100, Брестское областное управление ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Бреста, код банка – AKBBBY21100, УНП 290433924, в срок до 17.30 02.09.2020 г.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

Перечень документов, представляемый участником аукциона: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Лицо, желающее принять участие в аукционе, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за право заключения договора аренды земельного участка), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников);

• в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Высоковским городским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка;

• в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;

• в течение одного месяца с момента осуществления государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома и согласовать ее;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством;

• до окончания срока аренды земельного участка совместно с горисполкомом решить вопрос его дальнейшего использования

Аукцион состоится 08 сентября 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Высокое, ул. Советских Пограничников, 1, каб. 11 (зал заседаний).
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30. 07.08.2020 г. до 17.30 02.09.2020 г. (перерыв с 13.00 до 13.45; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23.
Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ № 1:
- капитальное строение, инв. № 452/С-1727 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин «Универмаг»), общей площадью 1515,2 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Зельва, ул. 17 Сентября, 31;
- капитальное строение, инв. № 452/С-9004 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – тепловая сеть), протяженностью 127,9 м, расположенное по адресу: г. п. Зельва, ул. 17 Сентября, 31, тепловая сеть к зданию магазина;
- капитальное строение, инв. № 452/С-9003 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – канализационная сеть), протяженностью 20 м, расположенное по адресу: г. п. Зельва, ул. 17 Сентября, 31, канализационная сеть к зданию магазина;
- капитальное строение, инв. № 452/С-9005 (назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 20,5 м, расположенное по адресу: г. п. Зельва, ул. 17 Сентября, 31, водопроводная сеть к зданию магазина;
- капитальное строение, инв. № 452/С-9002 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – кабельная линия электропередачи 0,4 кВ), протяженностью 94,5 м, расположенное по адресу: г. п. Зельва, ул. 17 Сентября, 31, кабельная линия электропередачи к зданию магазина;
- тепловой узел; лестница; пожарная сигнализация; система видеонаблюдения; сигнализация ОТД2; сигнализация ОТД1; теплосчетчик

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422655100001000383, площадью 0,1736 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина «Универмаг») по адресу: г. п. Зельва, ул. 17 Сентября, 31

Начальная цена продажи – 250 200 руб. (двести пятьдесят тысяч двести рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 12 510 руб. (двенадцать тысяч пятьсот десять рублей)

Продавец – Зельвенский филиал Гроднооблпотребобщества, 231940, г. п. Зельва, ул. Советская, 25, тел. 2-45-34

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона – аукцион без условий. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 04 сентября 2020 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.03.2020 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 02 сентября 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

Лот № 1: автогидроподъемник АГП 22.04 на шасси автомобиля ЗИЛ 431410, № рамы 3218965, 1992 г. в.
Начальная цена продажи – 4 704 руб. (четыре тысячи семьсот четыре рубля) с учетом НДС.
Сумма задатка – 470 руб. (четыреста семьдесят рублей)

Продавец – ОАО «Белкард» г. Гродно, 230026, г. Гродно, ул. Счастного, 38, тел. 52-41-01

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по проведению независимой оценки в сумме 247,50.
Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 21 августа 2020 г. в 11.00
по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 02.06.2020 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 19 августа 2020 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by/

КАЛІ ЎЗЯЦЦА ТАЛАКОЙ

А вы заўважылі, як папрыгажэла Жодзіна?

Некалькі гадоў таму была распрацавана маштабная канцэпцыя развіцця Жодзіна, якая ўключала ў сябе практычна ўсе аспекты гарадской інфраструктуры, пачынаючы з пашырэння межаў і заканчваючы светлавым і кветкавым афармленнем вуліц і будынкаў. Глабальнае пераўтварэнне прынесла вынікі. У 2018-м Жодзіна стала пераможцам у рэспубліканскім конкурсе па добраўпарадкаванні. І многія пастаўленыя тады мэты сёння выкананы. Напрыклад, у канцы мінулага года горад прырос на 266 гектараў, а на працягу апошніх гадоў былі адрамантаваны дарогі, змяніліся некаторыя двары, з'явіліся пешаходныя развязкі і крэатыўныя аб'екты добраўпарадкавання, паведамляе газета «Жодзінскія навіны».

Дарогі, дарогі...

Адразу некалькі ключавых гарадскіх вуліц абнавіліся за апошнія гады. Да ліку такіх адносіцца і Маскоўская. Новы бардзюрны камень, зялёныя зоны, што адмяжоўваюць праезную частку ад пешаходных дарожак, якія «апрануты» ў тратуарную плітку... Акрамя гэтага, аўтобусныя прыпынкі перанесены ў аптымальныя месцы, установлена два святлафоры і 26 новых асвятляльных апор.

Як запэўнілі дарожнікі, на працягу пяці гадоў (такі гарантыйны тэрмін эксплуатацыі) пасля рамонту вуліца Маскоўская забяспечыць кіроўцам і пешаходам рух без сучка, задзірынкі і выбоінкі.

Ды і ўся вулічна-дарожная сетка так ці інакш абнаўляецца. Была заасфальтавана падарожная частка вуліцы Савецкай, праведзены ямачны рамонт дарог на вуліцах 8 Сакавіка, 50 год Кастрычніка, Ракасоўскага, Дзеравянкі, праспектаў Скарыны, Леніна, у завулку Маладзёжным.

А таксама зроблена суцэльнае асфальтаванне разбітага ўчастка вуліцы 8 Сакавіка (у раёне СШ № 6).

Любімы мой дворык

Добраўпарадкаваны горад — гэта не толькі роўныя дарогі, грамадскія тэрыторыі, што радуюць вока, але і тыя часткі, якія не заўсёды прыкметныя, — двары. Таму пастаянна комплексна ўладкоўваюцца дваровыя тэрыторыі, якія забяспечваюцца месцамі для паркоўкі, удасканальваюцца ўнутрыквартальныя праезды, ствараюцца пешаходныя дарожкі, бардзюры, дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі, дэкаратыўныя кампазіцыі, малыя архітэктурныя формы і кветнікі. Толькі за апошнія тры-чатыры гады праведзены капітальны рамонт дваровых тэрыторый практычна цэлага квартала: у межах праспекта Леніна і вуліцы Ракасоўскага (дамы № 6, 6а, 8 на вуліцы Ракасоўскага і 2, 4 на праспекце Леніна), у дварах па вуліцы 50 год Кастрычніка, 12-14, на праспекце Міру, 26—36, праспекце Леніна, 14а і іншых.

На сродкі, сабраныя падчас гарадскога суботніка, былі закуплены і ўстаноўлены дзесяць дзіцячых гульнявых пляцовак. У агульную скарбонку ўладкавання двароў уносяць уклад і гарадскія прадпрыемствы і арганізацыі. Дзякуючы падтрымцы БелАЗа, ЦЭЦ, «Белаўтазапчастак», «Світанка» атрымалася добраўпарадкаваць двары і пешаходныя развязкі. Напрыклад, вялікі двор на вуліцы Савецкай, 11 адрамантаваны сіламі ААТ «Будмехсэрвіс». ЖКГ уладкавала двары на вуліцы Купрыянава: дамы 17, 19, 21. Таксама абнавіліся тэрыторыі каля дамоў № 13,19а на вуліцы Савецкай. Ізноў жа за кошт прадпрыемстваў і арганізацый у дварах з'явіліся і спартыўныя трэнажоры.

Бераг злева, бераг справа

У канцы мінулага года адбылося ўрачыстае адкрыццё моста ў Зарэччы. Сёння гэта сучасная, а галоўнае, бяспечная канструкцыя агульнай плошчай 252,5 кв. м, працягласцю 23,3 метра, разлічаная на вагавую нагрузку звыш 114 тон. Гэта значыць, па ёй можа спакойна рухацца як грузавая, так і сельгастэхніка. Пераправа цераз раку Пліса многія гады звязвала горад з Зарэччам, але не толькі жыхары прыватнага сектара карысталіся ёй, а і работнікі шэрагу буйных прадпрыемстваў.

Аднак у 2015 годзе канструкцыя была прызнана аварыйнай і закрыта на капітальны рамонт. Нягледзячы на ўсе цяжкасці з фінансаваннем і значныя змены ў першапачатковым праекце, мост, такі неабходны гораду, быў адкрыты, і бяспечны рух па ім адноўлены. Больш за тое, у далейшым праз яго плануецца зрабіць яшчэ адзін выезд на рэспубліканскую трасу М1.

З НАГОДЫ

МЕСЦА ДЛЯ ЖАБКІ

Яго шукалі жыхары Брэста

У адным з папярэдніх нумароў «МС» я пісала пра новы тэлеграм-канал кіраўніка Брэста Аляксандра Рагачука ў кантэксце самакіравання. Старшыня выканкама ледзь не кожны дзень падкідвае сваім падпісчыкам тэмы для абмеркавання. Дык вось прыкладна тыдзень таму мэр горада падзяліўся здымкам новага арт-аб'екта — жабкі.

Жабка пакуль знаходзіцца на адным з камунальных прадпрыемстваў і чакае свайго новага месца жыхарства. Мэр прасіў выказаць прапановы наконт магчымага адраса ўстаноўкі гэтай мілай скульптуры. А што — выглядае цікава. Ёсць жа помнік вераб'ю ў Баранавічах альбо сабаку ў Пінску — у нас няхай будзе жабка. Не дзіва, што многія адгукнуліся на заклік выказацца.

Праз некалькі дзён мэр падзяліўся лістамі, якія паступілі на электронную пошту выканкама. Гараджане прапаноўвалі пасяліць жабку на набярэжнай каля фантана, на рагу бульвара Касманаўтаў і вуліцы Міцкевіча. Адзін падпісчык выказаўся за тое, каб паставіць яе на вуліцы Войкава каля крамы «На балоце». Дарэчы, назва магазіна ўзялася не з паветра: гэту мясціну там так называюць вельмі даўно.

Далучаюся да меркавання мэра наконт апошняй прапановы: «Справядліва». А вось подпіс, на маю думку, можна нанесці іншы — з улікам мясцовасці. У аўтарскім варыянце арт-аб'екта ён выглядае так: *«Задушила многих, а некоторых и сейчас душит»*. Справа ў тым, што крама «На балоце» працуе ў кругласутачным рэжыме. Паводле слоў знаёмага таксіста, гараджане ў начны час ездзяць сюды «дагнацца». Дык, можа, варта ўспомніць адпаведны фразеалагізм ды напісаць нешта накшталт «Не набірайся як жаба гразі»?

Святлана ЯСКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 6 жніўня 2020 года.**